## ПАЦЯПЛЕЕ І БУДЗЕ ДАЖДЛІВА

**Ужо сёння на тэрыторыю Беларусі пачне паступаць больш цёплае і вільготнае паветра з боку поўдня Еўропы, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Федотава.**

У заходняй палове краіны будуць ісці дажджы, тэмпература ўдзень ад 4 на поўначы, да 11 градусаў на поўдні Беларусі. А вось у сераду Балканскі цыклон істотна сапсуе наша надвор'е: дажджы чакаюцца ўжо паўсюдна, месцамі дажджы моцныя. Тэмпература ўначы 0 — плюс 6, удзень — 4—11 цяпла. У другой палове тыдня надвор'ем у нашай краіне будзе кіраваць вільготная Атлантыка. Час ад часу будзе ісці дождж. У чацвер—пятніцу тэмпература будзе вагацца ад мінус 4 да плюс 5 градусаў, удзень — 1—9 цяпла.

Згодна з папярэднімі прагнозамі, захаваецца вільготнае надвор'е і ў выхадныя. У суботу часам апады ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Уначы каля 0, удзень — 1—8 цяпла. У нядзелю кароткачасовыя дажджы, месцамі туман, уначы — ад мінус 2 да плюс 5, удзень — 3—10 градусаў вышэй за нуль.

**Сяргей КУРКАЧ.**

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

19 КАСТРЫЧНІКА 2010 г.
АЎТОРАК
№ 204
(26812)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.



Фота БЕЛТА

# БЕЛАРУСЬ І ВЕНЕСУЭЛА ДАМОВІЛІСЯ АБ ПАСТАЎКАХ НАФТЫ НА 2011—2013 ГАДЫ

**БЕЛАРУСЬ і Венесуэла дамовіліся аб пастаўках нафты на сярэднетэрміновую перспектыву — на 2011—2013 гады. Гэта пытанне абмяркоўвалася 16 кастрычніка ў ходзе рабочага візіту ў Беларусь венесуэльскага лідара Уга Чавеса.**

Прэзідэнты Беларусі і Венесуэлы Аляксандр Лукашэнка і Уга Чавес правялі перагаворы ў вузкім і пашыраным складах, у час якіх абмеркавалі шырокі спектр пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва, а таксама абмяняліся думкамі па актуальных праблемах міжнароднага парадку дня. Сустрэчы ў вузкім складзе папярэднічалі перагаворы ў фармаце сам-насам. Усяго перагаворы лідараў дзвюх краін прадаўжаліся амаль 7 гадзін.

Прымаючы Уга Чавеса, кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў: «Вітаю цябе на ўжо тваёй беларускай зямлі. Ты ўклаў шмат сваёй энергіі, свайго добрага сэрца ў будаўніцтва назалежнай Беларусі, і аб гэтым ведаюць усе беларусы».

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Уга Чавесу за дапамогу нашай краіне: «У гэтую цяжкую хвіліну ты падставіў сваё плячо Беларусі, працягнуў руку дапамогі, і гэта мы будзем помніць заўсёды».

Кіраўнік беларускай дзяржавы запэўніў, што Беларусь зробіць для Венесуэлы ўсё, што ў яе сілах. «Я не хачу быць тваім даўжніком, у добрым сэнсе слова, не толькі ў матэрыяльным. Мы зробім для Венесуэлы столькі, што ты ніколі не пашкадуеш, што пачаў з намі супрацоўніцтва», — падкрэсліў ён.

Уга Чавес заявіў, што гарантуе стабільнасць паставак нафты ў Беларусь. «Мы ў курсе, што вашы нафтаперапрацоўчыя заводы маюць патрэбу ў нафце. У беларускіх НПЗ не будзе няхваткі нафты на гады наперад», — сказаў ён.

Гаворачы пра Беларусь, Прэзідэнт Венесуэлы адзначыў, што венесуэльскі народ ставіцца да яе таксама, як да радзімы, як і беларускі народ да Венесуэлы. «Мы прадаўжаем ісці па нашай дарозе, і будзем ісці заўсёды», — сказаў ён, маючы на ўвазе перспектывы нарошчвання супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі ў розных сферах.

СТАР. 2

## За 15 гадоў рэальная заработная плата павялічылася амаль у 5 разоў

**Аб гэтым паведаміла ўчора журналістам міністр працы і сацыяльнай абароны Мар'яна Шчоткіна, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Міністр прывяла параўнальныя даныя: за гэты перыяд рэальная зарплата ў Расіі, Казахстане і Украіне павысілася ў 3 разы. З 2000 па 2009 год рэальныя грашовыя даходы насельніцтва ўзраслі амаль у 3 разы. Розніца ў даходах 10 працэнтаў найбольш забяспечанага і 10 працэнтаў менш забяспечанага насельніцтва ў Беларусі складае да 5,9 раза. У Расійскай Федэрацыі гэты паказчык перавышае 15 разоў, у ЗША — прыкладна 16 разоў, у Германіі — каля 7 разоў, у Францыі — каля 9 разоў.

Паступальна павышаецца ўзровень дабрабыту жыхароў Беларусі. Узровень малазабяспечанага насельніцтва (з сярэднімі даходамі ніжэйшымі за бюджэт пражытковага мінімуму) у 2000 годзе быў роўны 42 працэнтам, у 2005-м — 13 працэнтам, а ў 2009-м — 5,4 працэнта. Мар'яна Шчоткіна ў якасці ілюстрацыі да росту дабрабыту беларусаў прывяла наступны факт: на тысячу жыхароў рэспублікі прыпадае 242 аўтамабілі. Гэта самы высокі паказчык на ўсёй постсавецкай прасторы.

На выплату пенсій у Беларусі ў 2011 годзе будзе зрасходавана Br16,5 трлн. Каментуючы зацвярджэнне бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны на 2011 год, Мар'яна Шчоткіна адзначыла, што 80,3 працэнта ўсіх выдаткаў фонду будзе накіравана на фінансаванне пенсійных выплат. Прычым усе фінансавыя патокі закладзены з лішкам, з улікам магчымасці павышэння памераў пенсій і дапамог. Дарэчы, фінансаванне на выплату ўсіх відаў дапамог па дзяржаўным сацыяльным страхаванні на 2011 год перавысіць Br3,5 трлн.

«Няма ніякай напружанасці: пенсіі будуць выплачвацца і ў далейшым стабільна, своечасова і ў поўным аб'ёме, — сказала міністр. — У нашай краіне і збор страхавых узносаў, і расходаванне сродкаў фонду знаходзяцца пад кантролем дзяржавы».

Цяпер 27 працэнтаў жыхароў Беларусі — пенсіянеры. Працягласць жыцця з кожным годам узрастае — гэта пазітыўны аспект. Пры гэтым захоўваецца ўзрост выхаду на пенсію 55 гадоў для жанчын, 60 гадоў для мужчын.

Мар'яна Шчоткіна дадала, што кожны пяты пенсіянер выйшаў на пенсію датэрмінова, на 5-10 гадоў раней агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту. У Беларусі ў адрозненне ад іншых краін захаваны інстытут ільготных пенсій — гэта таксама фактар абароны работнікаў.

Сярэдні памер пенсій усіх відаў у жніўні склаў Br530 тыс., сярэдні памер пенсіі па ўзросце — Br555 тыс., што складае ў эквіваленце $176. Па ўзроўні пенсійнага забеспячэння Беларусь знаходзіцца на другім месцы ў СНД пасля Расійскай Федэрацыі.

## Прэзідэнт Літвы наведае Беларусь з рабочым візітам

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 20 кастрычніка правядзе сустрэчу з Прэзідэнтам Літвы Даляй Грыбаўскайтэ, якая будзе знаходзіцца ў Беларусі з рабочым візітам.**

Плануецца, што перагаворы кіраўнікоў дзяржаў пройдуць у вузкім і пашыраным складах. Асноўнай іх тэмай стане развіццё гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. Прэзідэнты таксама абмяняюцца меркаваннямі па актуальных пытаннях міжнароднага парадку дня. Акрамя таго, плануецца, што па выніках перагавораў будзе падпісаны шэраг двухбаковых дакументаў.

Прэзідэнт Беларусі ў рамках афіцыйных візітаў наведваў Літву ў 1995 і 2009 гадах. У верасні 2009 года ў ходзе візіту ў Вільнюс кіраўнік беларускай дзяржавы запрасіў Прэзідэнта Літвы наведаць з візітам у адказ нашу краіну.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

Твае правы

# ЯК АТРЫМАЦЬ ТЭХНІЧНЫЯ СРОДКІ?

**Як сведчыць статыстыка, у Беларусі налічваецца больш за паўмільёна інвалідаў, прычым не сакрэт: многія з іх маюць патрэбу ў тэхнічных сродках рэабілітацыі. Між тым, куды па іх трэба звяртацца, якія тут неабходна прадаставіць дакументы і што рабіць, калі сродкі рэабілітацыі проста сапсаваліся? Каб адказаць на гэтыя пытанні, карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з намеснікам начальніка ўпраўлення сацыяльнай падтрымкі насельніцтва камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Ірынай Мікалаеўнай Дудка.**

### ШТО І ДЗЕ МАГЧЫМА АТРЫМАЦЬ?

Куды звяртацца па неабходныя сродкі тэхнічнай рэабілітацыі інвалідам I-II груп і дзецям-інвалідам ва ўзросце да 18 гадоў — пытанне заўсёды важнае. Тут існуе наступнае правіла. Калі патрэбны ўсе віды калясак, крэсла функцыянальнае з суднам, веласіпед трохколавы для дзяцей ва ўзросце да 10 гадоў з захворваннем на ДЦП, падушка супрацьпролежневая для сядзення ў калясцы, уцеплены чахол для перасоўвання ў калясцы, спецыяльная абарона для рук пры перасоўванні ў калясцы, хадункі, столік для інваліднай каляскі, крэсла і прыстасаванне для ўтрымання стоячы для дзяцей са спінна-мазгавой паталогіяй, супрацьпролежневы матрац, пад'ёмная перакладзіна да ложка, прыложкавы столік, поручні для туалета-ваннай і душавой, апорнае ложкавае прыстасаванне, прыстаўка да ўнітаза, сядзенне для ваннай, прыстасаванні для туалета для дарослых і дзяцей, дыктафон ці плэер, сотавыя тэлефоны і ў тым ліку смартфоны, прыстасаванне для праслухоўвання агучанай літаратуры (плэер), гадзіннік з сінтэзатарам маўлення, тэлефон з узмацняльнікам гуку, светлавы гадзіннік ці сігналізатар гуку «Нянечка», то варта падаваць дакументы ў раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне або ў Мінску — ва ўпраўленне сацыяльнай абароны.

Атрымаць розныя віды кіёў, мыліцы, пратэзы і артэзы верхніх, ніжніх канечнасцяў і тулава, экзапратэзы малочнай залозы з ліфамі, вырабы для лячэбнага пратэзавання дзяцей (абдукцыйныя трусікі, распоркі і г.д.), спецрукавіцы, артапедычны абутак, боцікі Дзікуля, артапедычныя абутковыя вырабы (укладныя боцікі, падкаленнікі, панчохі-паўзункі і гэтак далей — за выключэннем вусцілак) можна праз Беларускі пратэзна-артапедычны аднаўленчы цэнтр у Мінску ці яго філіялы ў рэгіёнах.

СТАР. 2

Пытальнік

# «Ніякага ліміту на кошт лекаў, што выпісваюцца грамадзянам, няма»

**Я знаходжуся на абслугоўванні па стане здароўя. Ужо амаль год як у нас няма ўчастковага ўрача, хаця вуліца самая вялікая. Каб выпісаць лекі, даводзіцца звяртацца да ўрачоў з іншых участкаў. Пачынаецца важданіна: мы не ведаем, якія можна выпісваць лекі і на якую суму, пералікаў у нас няма. Да 5 тысяч яшчэ выпішуць, вышэй — «мы не ведаем». Выходзіць, трэба ўжываць не тыя лекі? Прашу ўдакладніць гэтае пытанне.**

**Сцяпан Мяфодзьевіч ПРЫХОДЗЬКА,**
*г. Калінкавічы.*

Пытанне чытача мы пераадрасавалі ў Калінкавіцкую цэнтральную раённую бальніцу. Афіцыйны адказ адтуль прыйшоў за подпісам галоўнага ўрача А. Шаўко.

«Урач тэрытарыяльнага тэрапеўтычнага ўчастка ў зоне абслугоўвання (вуліца Азёрына) зараз знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці да трох гадоў. На час адсутнасці ўчастковага ўрача вуліцы замацаваныя за ўрачамі тэрапеўтамі-ўчастковымі раённай паліклінікі. Вуліца Азёрына абслугоўваецца ўрачом Шостак.

Выпіска лекаў адбываецца на падставе пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30.11.2007 г. № 1650 «Аб некаторых пытаннях бясплатнага і льготнага забеспячэння лекавымі сродкамі і перавязачнымі матэрыяламі асобных катэгорый грамадзян», пастановы Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 16.07.2007 г. № 65 «Аб зацвярджэнні пераліку асноўных лекавых сродкаў» і ад 15.10.2009 г. № 111 «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у пастанову Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 16.07.2007 г. № 65».

Рэдакцыі гэты адказ здаўся не зусім поўным (што можа сказаць чалавеку адна толькі назва дакумента?), таму мы патэлефанавалі ў Калінкавіцкую цэнтральную раённую бальніцу. Там, у прыватнасці, высветлілася, што нашаму чытачу льготы, у тым ліку і па медыцынскім абслугоўванні, былі адноўлены адносна нядаўна — як чалавеку, што працаваў на прыфрантавых дарогах. Гэтым, напэўна, і тлумачыцца змест ліста заяўніка — магчыма, чалавек яшчэ не паспеў разабрацца ва ўсіх нюансах. Нам заявілі таксама, што ніякага ліміту на кошт лекаў, якія выпісваюцца грамадзянам, няма. Самі ж лекі прызначаюцца згодна з пратаколамі лячэння. У адказе пералічаныя дакументы, згодна з якімі адбываецца выпіска лекаў, паколькі гэты пералік займае 80 старонак. Ці ёсць сэнс друкаваць яго цалкам? Што датычыць пытання чытача пра ўрача-тэрапеўта, нам дадалі, што вуліцы замацаваныя за іншымі медыцынскімі работнікамі з той простай прычыны, што замены — вольнага работніка — папросту няма.

Мы дамовіліся, што з бальніцы патэлефануюць дадому Сцяпану Мяфодзьевічу, спытаюць, што з таго пераліку лекаў канкрэтна яго цікавіць і ці ёсць у яго яшчэ якія пытанні да медыкаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

У эпіцэнтры дзяржаўнай палітыкі

# ВЫСОКАЕ ЗВАННЕ — «ГАСПАДАР»








**Творчая брыгада «Звязды» ў чарговы раз пабывала ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Баранавічыхлебапрадукт». Гэта адзін з буйнейшых у Беларусі перапрацоўшчыкаў збожжа і самы буйны вытворца камбікармоў. А таксама надзвычай клапатлівы партнёр і апякун беларускіх гаспадынь, бо пастаўляе на ўнутраны рынак ў значнай колькасці не толькі муку класа «Экстра» і разнастайныя крупы, але і папулярныя наборы паўфабрыкатаў для сямейнага ўжытку пад брэндам «Гаспадар».**

**Прадпрыемства — неаднаразовы лаўрэат Прэміі ўрада за дасягненні ў галіне якасці, мае Дыплом міжнароднага конкурсу «Выбар года 2009» за перамогу ў намінацыі «Крупа № 1» і іншыя заслужаныя ўзнагароды.**

**Яшчэ адзін цікавы штрых: у склад акцыянернага таварыства, акрамя буйных мукамольнай і камбікормавай вытворчасцяў, іншых профільных падраздзяленняў, уваходзяць таксама адзін з найбуйнейшых у Беларусі комплексаў па вытворчасці свініны «Усходні», развітая сетка фірменнага гандлю, а таксама СВУ — сельскагаспадарчы вытворчы ўчастак. Каб зразумець, што гэта за ўчастак, дастаткова сказаць: сфарміраваны ён на землях трох былых калгасаў.**

**Наш першы субяседнік — генеральны дырэктар, сенатар Наталія МАНЬКО.**

— У працы любога вытворчага калектыву важна ўсё, але адзін з вызначальных паказчыкаў — тэмп росту выпуску таварнай прадукцыі ў супастаўных цэнах. Бо праз яго дасягаецца і рост заработнай платы, і занятасць насельніцтва. Заданне прадпрыемству на год 115,3 працэнта — ад дасягнутага ўзроўню, і я думаю, што яно будзе выканана. Удакладненне «ад дасягнутага ўзроўню» тут дарэчы, бо тлумачыць, што мы і раней працавалі дастаткова эфектыўна, старанна, і далейшы прырост магчымы толькі за кошт унутраных рэзерваў і далейшай мадэрнізацыі вытворчасці.

***— У такім разе пра мадэрнізацыю вытворчасці давайце і пагаворым.***

— У нас зараз рэалізуецца адразу некалькі інвестыцыйных праектаў. На галаўным прадпрыемстве завяршылі рэканструкцыю другога млына, пабудаваны ён у адпаведнасці з патрабаваннямі Еўрастандартаў, устаноўленая лінія мучных сумесяў дазваляе прапанаваць гандлю любую сумесь. Акрамя традыцыйных сумесяў для бліноў, аладак, піцы, робім і сумесі для пончыкаў, сумесі для цеста дражджавога, для цеста пясочнага. Зрабілі новую сумесь для выпякання пшанічнага хлеба — сёння многія гаспадыні маюць спецыяльныя хлебапечкі. Высыпаеш туды гэтую сумесь, дадаеш вады, і больш нічога не трэба. Можна кожны дзень частаваць сям'ю ўласным свежым хлебам.

Па млыне мы атрымалі 30 працэнтаў эканоміі энергарэсурсаў, як і планавалі. Атрымалі эканомію і людскіх рэсурсаў, бо зараз працэс абслугоўвае адзін чалавек. На экране манітора ён бачыць, як працуе ўвесь тэхналагічны ланцужок, і можа не толькі кантраляваць, але і ўмешвацца.

З іншых навін асноўнай вытворчасці — будаўніцтва лініі камбікармоў для «дзетак» — нованароджаных цялят, парасят, птушанят. Пакуль што такія камбікармы гаспадаркі купляюць за мяжой, і наша новае будаўніцтва вядзецца па праграме імпартазамяшчэння. Следам будзем устанаўліваць лінію па выпуску камбікармоў для каштоўных парод рыб, у тым ліку для асятровых. А пакуль рыбгасы гэты корм імпартуюць і разлічваюцца цвёрдай валютай.

На наступны год плануем будаўніцтва дадатковых ёмістасцяў для захоўвання зерня, нам іх не хапае, таму што нарыхтоўка ідзе аднамомантна, і патрэбна стварыць запас зерня на год і нармальна яго захоўваць. Сёння мы часткова захоўваем і ў калгасах, але каб не страціць ні грама ўраджаю, патрэбны ўласныя ёмістасці, дзе вытрымліваюцца свае тэхналогіі — падпрацоўка, сушка, ахалоджванне зерня, яго вентыляцыя, захаванне патрэбнай вільготнасці і г.д.

Ёсць навіны і ў нашым аграрным сектары. Зараз пашыраем свінакомплекс — рэалізуем інвестыцыйны праект па рэканструкцыі адкормачнікаў на 15 тысяч галоў. Аб'ёмы вытворчасці мяса адчувальна павялічацца.

У СВУ ўзводзім высокамеханізаваную малочнатаварную ферму на 500 галоў. Сёння наш сельскагаспадарчы вытворчы ўчастак — зусім іншае прадпрыемства і зусім іншы калектыў, чым яшчэ нядаўна. Паляводы нядрэнна спрацавалі па ўраджайнасці — я думаю, што разам з кукурузаю будзем мець каля 10,5 тысячы тон зерня. Важна, што аграрным нашым сектарам сёлета атрыманы добры ўраджай менавіта харчовага зерня, і мы не будзем закупляць пшаніцу для вытворчасці мукі. Па якасных паказчыках пшаніца з нашых палеткаў, як і з палёў гаспадарак нашай сыравіннай зоны, адпавядае мукамольным кандыцыям і дазволіць атрымаць муку самых высокіх марак. Раней мы заўсёды закуплялі імпартную пшаніцу з высокім утрыманнем клейкавіны і дабаўлялі да беларускай. Фуражнага зерня сёлета нарыхтавалі крыху менш, чым звычайна, але ўласныя патрэбы — і свінакомплекса, і СВУ — у камбікармах забяспечым.

Калі вяртацца да агульнай нашай эканомікі, то адзінае, што нас хвалюе, — не вельмі высокая рэнтабельнасць у цэлым па таварыстве. Прычына ў тым, што практычна ўвесь асартымент у нас — сацыяльна значымая прадукцыя, цэны на яе рэгулююцца на дзяржаўным узроўні. 3,5 працэнта рэнтабельнасці — малавата для развіцця прадпрыемства. Але ўсё роўна мы не стаім на месцы. Сёлета ў праграмы ўласнага развіцця накіруем з усіх крыніц 29 мільярдаў рублёў. Згадзіцеся — лічба прыгожая!

***— Наталія Віктараўна, прадпрыемства — шматпрофільнае. Якія прыярытэты вы для сябе вызначылі? Хто больш мілы дырэктарскаму сэрцу?***

— Тут як у паэта: «Все профессии нужны, все профессии важны». Больш і дабавіць няма чаго.

***— А як вы ішлі да гэтай шматпрофільнасці? Вам нешта моцна навязвалі, ці гэта ваш выбар?***

— Мы з калегамі сумленна выконваем свой абавязак, і калі бачылі, што для карысці справы патрэбна зрабіць той ці іншы крок — нават не просты, нават вельмі не просты, як тое ж далучэнне адразу некалькіх «правальных» гаспадарак, мы ўсвядомлена ішлі на гэты крок. Альбо далучэнне комплексу «Усходні»... Гэта буйны наш спажывец, і, згубіўшы яго, мы страцілі б пэўную колькасць людзей на асноўнай вытворчасці. У выніку сёння наша структура нармальна збалансаваная, усе падраздзяленні ўвязаныя агульнымі інтарэсамі і працуюць зладжана. Гэта яшчэ адна прычына эфектыўнай работы вытворчага канвеера.

***— Вы маеце на ўвазе пастаўку камбікармоў спажыўцам унутры таварыства?***

— У тым ліку і гэта. Адна справа — пастаянны спажывец, гарантаваны збыт (а гэта — пастаянная работа для камбікормавых цэхаў) і ўзаемны кантакт вытворцы са спажыўцом. Узаемная шліфоўка адносінаў і прадукцыі, што працуе на канечны вынік. Нам станоўчы імідж вытворцы камбікармоў у многім сфарміраваў наш жа «Усходні».

І зусім іншая справа — «знешнія» спажыўцы на рынку, нават на айчынным. Сёння яны ў аднаго вытворцы набылі машыну камбікорму, заўтра ў другога, паслязаўтра ў трэцяга. Разгрузілі ў адну кучу, і без уліку спажыўнай каштоўнасці і без распрацоўкі рацыёна кармлення пачынаюць карміць жывёлу... Я ў нейкай ступені ўтрырую, па вялікім рахунку ў нас са «знешнімі спажыўцамі» асаблівых праблем няма. Калі з'яўляюцца, мы іх стараемся ўрэгуляваць.

Уласны комплекс і сельскагаспадарчы ўчастак — гэта яшчэ і пляцоўка для адпрацоўкі новых відаў камбікармоў, прымянення новых дабавак.

***— Якая прадукцыя вашых вытворчых падраздзяленняў дамініруе ў структуры даходаў?***

— Вытворчасць камбікармоў, рэалізацыя мяса свініны і мясаперапрацоўка. У нас свой цэх перапрацоўкі мяса, які забяспечвае гандлёвую сетку каўбаснымі вырабамі, паўфабрыкатамі і нават далікатэснай прадукцыяй. Мы ўкаранілі там усе мерапрыемствы сістэмы ХАССП. На парадку дня стаіць узвядзенне новага цэха ці нават завода па перапрацоўцы мяса свініны з вынасам яго за тэрыторыю комплексу. Праўда, тут чарговасць можа быць такой: спачатку мы павінны пабудаваць новы ўчастак забою жывёлы, а потым і мясаперапрацоўчае прадпрыемства, што дасць магчымасць аснасціць абодва гэтыя падраздзяленні навейшым высокатэхналагічным абсталяваннем і яшчэ больш пашырыць асартымент выпускаемай прадукцыі.

Пакуль жа нашы вытворчыя магутнасці па перапрацоўцы не спраўляюцца з валам свініны з нашага комплексу, таму частку яе здаём на Бярозаўскі мясакамбінат. А нам было б больш выгадна займацца перапрацоўкай самім.

***— Скажыце, ці дапамагае вам такая шматпрофільнасць? Вы маеце магчымасць пераліваць сродкі з адной галіны ў іншую і такім чынам падтрымліваць тых, каму неабходна дапамога; магчымасць акумуляваць сродкі ў адзін «кулак» для вырашэння стратэгічных задач?..***

— Сярод законаў бізнэсу ёсць і такі: не кладзі яйкі ў адзін кошык. Быў перыяд, калі ў сілу чыста рынкавых абставін мука была дастаткова праблемнай пазіцыяй, і нас два гады ратавалі камбікармы. Рынак — гэта жывы арганізм, дзейнасць якога залежыць ад многіх фактараў, у тым ліку ад надвор'я, я тут нічога новага не адкрываю. Менавіта з-за капрызаў надвор'я ўзніклі збожжавыя праблемы ў суседняй Расіі, і сёння наша мука там больш запатрабаваная. Задача для нашых маркетолагаў — асвойваць неабсяжны расійскі рынак. Вядзём, у прыватнасці, перамовы з масквічамі, у «белакаменнай» знаходзіцца наш спецыяліст, падалі заяўкі і на ўдзел у буйнай расійскай галіновай выстаўцы. А задача для нашых вытворцаў — найлепшым чынам атаварыць усе заключаныя дагаворы на пастаўку.

Патрэбна сказаць добрае слова і ў адрас уласнай гандлёвай сеткі. У нас дастаткова развіты фірменны гандаль, ён забяспечвае абаротнымі сродкамі і пры гэтым не ставіць патрабаванне: дайце тэрмін рэалізацыі 60 дзён, як іншым разам бывае ва ўзаемаадносінах з староннімі гандлёвымі арганізацыямі. Назіраецца рост рознічнага тавараабароту — на ўзроўні 140 працэнтаў. Цудоўныя паказчыкі ў фірменнага магазіна «Гаспадар» у Мінску, у сталіцы яго нават занеслі на Дошку гонару.

***— На вас нейкім чынам паўплываў крызіс?***

— Спецыфіка нашага прадпрыемства вядомая: вырабляем муку, камбікармы, мяса — гэта тавары штодзённага попыту. А людзей карміць трэба — і ў прадпрыемствах грамадскага харчавання, і ў сем'ях, як бы ні падціскаў крызіс. Так што нас ён не асабліва зачапіў. Магчыма, мы былі крыху большымі рэалістамі, калі фарміравалі свае інвестыцыйныя праекты.

СТАР. 6






Майстар збожжасховішча камбікормавага комплексу Валерый ЯКІМЧЫК.



Машыніст расфасовачна-ўпакавальнага абсталявання Соф'я ТАРАСЕВІЧ на прадпрыемстве 36 гадоў.

ISSN 1990 - 763X

# Беларусь і Венесуэла дамовіліся аб пастаўках нафты на 2011—2013 гады

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Уга Чавес падзякаваў беларускаму боку за падтрымку і дапамогу Венесуэле ў частцы абмену тэхналогіямі, рэалізацыі праектаў у сферы жыллёвага будаўніцтва, прамысловай кааперацыі, супрацоўніцтва ў галіне нафтахіміі. Ён таксама падзякаваў Беларусі за гатоўнасць падзяліцца з Венесуэлай «усім, што тут вырабляецца, заводамі, магутнасцямі». «Гэта бясцэнна, асабліва ў сучасным свеце», — адзначыў Прэзідэнт Венесуэлы.

«Тут няма даўжнікоў — мы таварышы, і мы разам будуем альтэрнатыву імперыялізму. Гэта шматпалярны свет», — дадаў Уга Чавес.

У час сустрэчы са сваім венесуэльскім калегам у пашыраным складзе Аляксандр Лукашэнка заявіў: «Мы вызначылі супрацоўніцтва з Венесуэлай як стратэгічны і адзін з самых прыярытэтных напрамкаў знешняй палітыкі Беларусі». Паводле яго слоў, развіццё стратэгічнага двухбаковага супрацоўніцтва «вядзе да ўмацавання пазіцый нашых дзяржаў на міжнароднай арэне, садзейнічае сацыяльна-эканамічнаму развіццю ў роўнай ступені Венесуэлы і Беларусі».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што беларуска-венесуэльскае супрацоўніцтва сёння — гэта ўжо дзясяткі шматмільённых кантрактаў і праграм. Ён падзякаваў венесуэльскаму боку за арганізацыю паставак у Беларусь вуглевадароднай сыравіны: «Мы асабліва ўдзячны кіраўніцтву і работнікам Венесуэльскай нафтавай кампаніі, якая выконвае ўсе дамоўленасці». Прэзідэнты абмеркавалі далейшыя напрамкі супрацоўніцтва ў гэтай важнай сферы і па ўсіх пытаннях, што ўзнімаліся, дамовіліся на будучае. «Упэўнены, ваш цяперашні візіт будзе новым этапам у развіцці супрацоўніцтва, і ён абавязкова прывядзе да станоўчых вынікаў», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Беларускі лідар адзначыў, што за даволі кароткі прамежак часу Беларусі і Венесуэле ўдалося зрабіць нямала для развіцця супрацоўніцтва ў галіне нафтахіміі, будаўніцтва, газіфікацыі, у прамысловасці, сельскай гаспадарцы. «Але трэба будзе, як вынікае з сённяшніх перагавораў, зрабіць значна больш для паглыблення нашых сувязяў», — сказаў ён. Гэта датычыцца не толькі сувязяў у прамысловасці, здабычы нафты і прыроднага газу, будаўніцтва інфраструктуры, але і ўзаемадзеяння ў сферах адукацыі, культуры, спорту.

Прэзідэнт Беларусі павіншаваў Уга Чавеса з пераканаўчай перамогай яго прыхільнікаў на парламенцкіх выбарах 26 верасня. «Вынікі галасавання сведчаць аб шырокай народнай падтрымцы, што пацвярджае правільнасць выбранага вамі курсу, — адзначыў ён. — Ваша перамога будзе садзейнічаць умацаванню супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Венесуэлай, а таксама далейшаму развіццю стратэгічнага альянсу паміж нашымі краінамі».

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз падзякаваў венесуэльскаму боку «за каласальную дапамогу, што аказваецца беларускаму народу ў гэты няпросты час». «Разлічвайце на нас — усё, што мы можам, усё, на што мы здольныя, а мы можам нямала, мы гатовы зрабіць для венесуэльскага народа ў знак удзячнасці за тое, што зрабілі вы для нас», — падкрэсліў ён. Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў, што ў Беларусі з асаблівай сімпатыяй ставяцца да Уга Чавеса і венесуэльскага народа, радуюцца поспехам Венесуэлы.

У сваю чаргу Уга Чавес заявіў, што Венесуэла знайшла брацкі народ у цэнтры Еўропы. «Вельмі важна, каб нашы народы маглі адчуць тое, у што можа выліцца гэта супрацоўніцтва. Дзякуй вам у першую чаргу за вашу працягнутую руку дружбы, — сказаў Прэзідэнт Венесуэлы. — Баліварыянская рэвалюцыя, народ Венесуэлы — мы знайшлі тут, у сэрцы Еўропы, брацкі народ і радзіму, таксама як і вы ў нас».

Гаворачы аб выніках перагавораў, ён адзначыў, што сёння прымаюцца новыя рашэнні, каб надаць дадатковы імпульс беларуска-венесуэльскаму альянсу і дружбе.

Прэзідэнт Венесуэлы падзякаваў за магчымасць пастаўляць нафту ў Беларусь. «Мець магчымасць прывезці нафту з Венесуэлы ў сэрца Еўропы на вашы НПЗ — гэта вельмі стратэгічна важна для нас. Вы нам даяце магчымасць ствараць новыя шляхі для гандлю нашай нафтай, — сказаў ён. — Мы ганарымся тым, што нашы караблі могуць дастаўляць у Беларусь або праз Чорнае, або праз Балтыйскае мора нашу нафту».

Уга Чавес адзначыў, што Беларусь і Венесуэла ўжо супрацоўнічаюць у многіх сферах — ад нафтахіміі, жыллёвага будаўніцтва, прамысловай кааперацыі да сельскай гаспадаркі і культурных сувязяў. Сёння бакі вызначылі дадатковыя напрамкі для супрацоўніцтва. «Мы вырашылі знайсці магчымасць будаўніцтва ў Венесуэле заводаў па вырабе адзення, абутку. Таксама мы можам займацца вытворчасцю мэблі», — сказаў Прэзідэнт Венесуэлы.

Ён падкрэсліў, што Беларусь, нягледзячы на сусветны эканамічны крызіс, не спынілася ў сваім развіцці, захаваўшы ўзровень жыцця насельніцтва, нізкі ўзровень беспрацоўя, якасную адукацыю, ахову здароўя. «Мы прызнаём заслугі ўсяго беларускага народа», — дадаў Уга Чавес.

Па выніках перагавораў у прысутнасці прэзідэнтаў дзвюх краін быў падпісаны шэраг двухбаковых дакументаў. У прыватнасці, ЗАТ «Беларуская нафтавая кампанія» і кампанія «Петролеас дэ Венесуэла» падпісалі кантракт на пастаўку нафты ў 2011—2013 гадах. У адпаведнасці з дакументам у Беларусь будзе штогод пастаўляцца да 10 млн тон венесуэльскай нафты.

Падпісаны таксама Мемарандум аб узаемаразуменні паміж РУП «ВА Беларуснафта» і АТ «Венесуэльская нафтавая кампанія» аб далучэнні плошчаў да сумеснага прадпрыемства «Петралера БелаВенесалана». Дакумент пацвярджае намер Венесуэлы перадаць Беларусі два новыя радовішчы, што, з улікам існуючых, дасць магчымасць беларускаму боку здабываць больш за 1 млн тон нафты ў год.

Таксама падпісаны ўстаноўчы акт (статут) сумеснага прадпрыемства АТ «СэрвісіяБелаВенесалана», якое будзе займацца бурэннем і рамонтам нафтавых свідравін на тэрыторыі Венесуэлы. Акрамя таго, заключана пагадненне паміж урадамі Беларусі і Венесуэлы аб прававой дапамозе па крымінальных справах.

Пасля завяршэння афіцыйных перагавораў ад імя кіраўніка беларускай дзяржавы быў дадзены абед у гонар Прэзідэнта Венесуэлы.

Беларуска-венесуэльскія адносіны за чатыры з невялікім гады з моманту першай сустрэчы прэзідэнтаў дзвюх краін выйшлі на ўзровень стратэгічнага партнёрства і сталі ўзорам плённага і дынамічнага міжнароднага супрацоўніцтва. У многім характар двухбаковых кантактаў вызначаецца дружалюбнымі адносінамі кіраўнікоў дзяржаў. Прэзідэнт Беларусі двойчы, у снежні 2007 і сакавіку 2010 года, наведваў Венесуэлу з візітамі. У сваю чаргу, гэта пяты ўжо візіт Уга Чавеса ў Беларусь. Папярэднія адбыліся ў 2006, 2007, 2008 і 2009 гадах. Дасягнута дамоўленасць аб правядзенні рэгулярных (не радзей як адзін раз у год) сустрэч на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў.

Цяпер абодва бакі рэалізуюць буйнамаштабныя праекты ў эканоміцы, у дзясяткі разоў нарасціла тавараабарот, стварылі трывалую нарматыўна-прававую базу адносін, перайшоўшы ад простага гандлю да актыўнага кааперацыйнага супрацоўніцтва.

У ходзе перагавораў 16 кастрычніка прэзідэнты падвялі своеасаблівыя прамежкавыя вынікі сумеснай работы і «зверылі гадзіннікі», прадметна абмеркаваўшы перспектывы двухбаковых адносін. Адзначана неабходнасць больш хуткай рэалізацыі сумесных праектаў у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, будаўніцтве, нафтахіміі.

Заводы па выпуску грузавых аўтамабіляў і трактароў на тэрыторыі Венесуэлы павінны пачаць працаваць ужо менш як праз год. Таксама будуецца завод па вытворчасці будматэрыялаў. Беларусь гатова нарасціць пастаўкі ў Венесуэлу сельскагаспадарчай прадукцыі, больш актыўна ўдзельнічаць у стварэнні там сучаснага аграпрамысловага комплексу.

Беларусь і Венесуэла дакладна вызначыліся па пытанні паставак венесуэльскай нафты ў Беларусь на сярэднетэрміновую перспектыву. Гэта вельмі важна і для тых краін, праз тэрыторыю якіх нафта паступае ў Беларусь.

Акрамя таго, на перагаворах абмяркоўвалася пытанне венесуэльскіх інвестыцый у беларускую эканоміку. Удзел кампаній з Венесуэлы ў прыватызацыі беларускіх прамысловых прадпрыемстваў можа стаць чарговым узаемавыгадным напрамкам двухбаковага супрацоўніцтва.

Абмяркоўваліся і перспектывы сумеснага выхаду на рынкі трэціх краін, у тым ліку праз Беларускі гандлёвы дом у Венесуэле, работа па стварэнні якога ўжо актыўна вядзецца.

Вялікую ўзаемную цікавасць уяўляе магчымасць супрацоўніцтва па лініі праграм тэхнічнай дапамогі, што рэалізуюцца ў інтэграцыйным аб'яднанні «Баліварыянская альтэрнатыва для народаў нашай Амерыкі» (АЛБА). Беларусь гатова тут актыўна працаваць — ад паставак неабходных краінам АЛБА тавараў да перадачы партнёрам сваіх напрацовак у галіне эканамічнай і харчовай бяспекі.

Беларусі і Венесуэле трэба таксама пашыраць супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы, больш актыўна ісці насустрач адзін аднаму ў такіх галінах, як адукацыя, культура, спорт, турызм, навука.

Кіраўнікі дзяржаў сышліся на думцы, што патэнцыял беларуска-венесуэльскіх адносін вялікі, але пакуль выкарыстоўваецца толькі яго малая частка. Таму неабходна нарошчваць і хуткасць, і аб'ёмы супрацоўніцтва.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# ВЕНЕСУЭЛА БУДЗЕ ПАШЫРАЦЬ СУПРАЦОЎНІЦТВА З БЕЛАРУССЮ Ў МАШЫНАБУДАЎНІЧАЙ СФЕРЫ

**Венесуэла мае намер пашыраць супрацоўніцтва з Беларуссю ў сельскагаспадарчай і машынабудаўнічай сферах. Сваю зацікаўленасць у актывізацыі гэтых кантактаў пацвердзіў Прэзідэнт Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла Уга Чавес па выніках другога дня рабочага візіту ў Беларусь.**

Па прапанове кіраўніка беларускай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі венесуэльскі лідар пашырыў праграму знаходжання ў Беларусі і 17 кастрычніка пабываў на беларускіх прадпрыемствах. Прычым наведванне некаторых першапачаткова не ўваходзіла ў яго планы.

Спачатку Уга Чавес накіраваўся ў сталічны мікрараён Каменная Горка. На прыкладзе новага дома, які нядаўна пабудавала ААТ «МАПІД», ён азнаёміўся з магчымасцямі беларускага будаўнічага комплексу. Прэзідэнт Венесуэлы агледзеў планіроўку кватэр дзевяціпавярховага дома, які ўжо праз тыдзень прыме навасёлаў.

Уга Чавес не выключыў магчымасці ўзвядзення буйнапанэльных жылых дамоў у Венесуэле. «Мы запрасілі папрацаваць вашых будаўнікоў у Венесуэле і пабудаваць аналагічны дом», — сказаў замежны госць.

Венесуэльскі лідар таксама наведаў агракамбінат «Дзяржынскі». Улічваючы той факт, што па беларускім узоры з дапамогай нашых спецыялістаў у Венесуэле пад ключ будзе будавацца аграгарадок, Прэзідэнт вырашыў сам паглядзець, як выглядае такі аб'ект. Яго ўражанне ад знаёмства з сучасным беларускім аграрным гарадком было станоўчае, а сустрэча з мясцовымі жыхарамі — цёплай.

Уга Чавес у час сустрэчы са спецыялістамі аграпрамысловага комплексу адзначыў, што Венесуэла ў будучыні павінна стаць аграрнай краінай, і ў сувязі з гэтым беларускі вопыт будзе вельмі запатрабаваны.

Наступнымі пунктамі праграмы візіту Прэзідэнта Венесуэлы былі БелАЗ і МАЗ. Цікавасць да тэхнікі гэтых прадпрыемстваў не выпадковая — ужо ў наступным годзе ў Венесуэле будзе пабудаваны завод па выпуску БелАЗаў разам з прадпрыемствам па вытворчасці МАЗаў.

У гэты ж дзень Уга Чавес разам з кіраўніком беларускай дзяржавы Аляксандрам Лукашэнкам азнаёміўся з выстаўкай тэхнікі і нафтагазавага абсталявання, якія вырабляюцца ў Беларусі. Выстаўка была разгорнута каля Нацыянальнай бібліятэкі. Венесуэльскаму лідару спадабаўся прадстаўлены на экспазіцыі энерганасычаны трактар «Беларус-3522». Прэзідэнт Венесуэлы сеў за руль і асабіста апрабаваў у руху навінку беларускага машынабудавання, а праехаўшы, сказаў: «Гэта супертрактар, мы гатовы яго купляць і будзем выпрабоўваць машыну на вялікіх пляцоўках».

Затым Прэзідэнт Венесуэлы разам з кіраўніком беларускай дзяржавы зрабіў экскурсію па Нацыянальнай бібліятэцы. Венесуэльскаму лідару падаравалі барэльеф Сімона Балівара, выкананы народным майстрам Мікалаем Несцярэўскім. Перад прэзідэнтамі дзвюх краін выступілі артысты музычных калектываў Лацінаамерыканскага культурнага цэнтра імя Сімона Балівара.

Пасля гэтага адбыўся рабочы абед ад імя Прэзідэнта Беларусі ў гонар высокага госця. Звяртаючыся да свайго калегі, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Без сённяшняга дня візіт не быў бы завершаным. Можа быць, сённяшні дзень у нечым нават больш важны, чым учарашні». Прэзідэнт Венесуэлы ў сваю чаргу адзначыў, што другі дзень яго рабочага візіту ў Беларусь быў выключна насычаны і плённы.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

**Новопольский сельский исполнительный комитет Пуховичского района Минской области проводит открытый аукцион по продаже земельных участков для строительства и обслуживания жилого дома гражданам Республики Беларусь, расположенных на территории сельсовета.**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Наличие инженерных сетей | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Гребень, д. 52 а 624484002101000108 | 0,1993 | Сети электроснабжения | 1375750 | 2 000 000 | 200 000 |
| 2 | д. Войровка, ул. Полевая, д. 11 624484001601000178 | 0,1232 | Сети электроснабжения | 1375750 | 2 000 000 | 200 000 |

Задаток перечисляется на р/с № 3600625110009 в ЦБУ № 626 г. Марьина Горка, ф-л № 500 МУ ОАО «АСБ Беларусбанк» 222810 г. М. Горка ул. Ленинская, 27, БИК 153001601, УНН 600177772, ОКПО 04429639, код платежа – 04901, Новопольский сельисполком.

Порядок проведения аукциона оговорен в Положении о его проведении. Аукцион состоится **8 декабря 2010 года в 15.00** по адресу: аг. Новополье, ул. Центральная, 21 (здание исполкома) Пуховичского района Минской области.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 2 декабря 2010 года до 17.00** по вышеуказанному адресу.

Телефоны: (801713) 30316, 30335; сайт в интернете Пуховичского райисполкома.

## ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# АБ РЭСПУБЛІКАНСКІМ БЮДЖЭЦЕ НА 2011 ГОД

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 14 верасня 2010 года*
*Ухвалены Саветам Рэспублікі 4 кастрычніка 2010 года*

**Артыкул 1.** Зацвердзіць рэспубліканскі бюджэт на 2011 год па выдатках у суме 39 611 384 915 тыс. рублёў, зыходзячы з аб'ёму даходаў, якія прагназуюцца ў суме 33 611 384 915 тыс. рублёў.

Устанавіць гранічны памер дэфіцыту рэспубліканскага бюджэту на 2011 год у суме 6 000 000 000 тыс. рублёў.

Ажыццявіць фінансаванне дэфіцыту рэспубліканскага бюджэту ў 2011 годзе згодна з дадаткам 1.

**Артыкул 2.** Рэспубліканскі фонд аховы прыроды, што ўтвараецца ў адпаведнасці з гэтым Законам, у 2011 годзе з'яўляецца дзяржаўным мэтавым бюджэтным фондам.

**Артыкул 3.** Уключыць у 2011 годзе ў рэспубліканскі бюджэт сродкі дзяржаўных мэтавых бюджэтных фондаў: рэспубліканскага фонду аховы прыроды, фонду нацыянальнага развіцця, фонду арганізацыі збору (нарыхтоўкі) і выкарыстання адходаў у якасці другаснай сыравіны, фонду ўніверсальнага абслугоўвання (рэзерву ўніверсальнага абслугоўвання), а таксама інавацыйных фондаў, што ўтвараюцца рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі, Беларускім рэспубліканскім саюзам спажывецкіх таварыстваў.

**Артыкул 4.** У 2011 годзе:

1. Зацвердзіць нарматывы адлічэнняў ад:

1.1. падатку на прыбытак, які выплачваецца арганізацыямі, маёмасць якіх знаходзіцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь, і арганізацыямі, у статутных фондах якіх 50 працэнтаў і больш акцый (доляў) належыць Рэспубліцы Беларусь:

які атрымліваецца на тэрыторыі адпаведнай вобласці, у даход рэспубліканскага бюджэту — у памеры 50 працэнтаў, у даход кансалідаванага бюджэту вобласці — у памеры 50 працэнтаў;

які атрымліваецца на тэрыторыі г. Мінска, у даход рэспубліканскага бюджэту — у памеры 85 працэнтаў, у даход бюджэту г. Мінска — у памеры 15 працэнтаў.

Нарматыў адлічэнняў ад падатку на прыбытак у даход бюджэту г. Мінска прадугледжвае перадачу сродкаў на будаўніцтва аб'ектаў Мінскага метрапалітэна ў суме 270 000 000 тыс. рублёў;

1.2. падатку на дабаўленую вартасць, які атрымліваецца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, у даход рэспубліканскага бюджэту — у памеры 70 працэнтаў, у даходы кансалідаваных бюджэтаў абласцей і бюджэту г. Мінска — 30 працэнтаў, у тым ліку ў кансалідаваны бюджэт Брэсцкай вобласці — 4,41 працэнта, Віцебскай — 3,9 працэнта, Гомельскай — 4,56 працэнта, Гродзенскай — 3,39 працэнта, Мінскай — 4,5 працэнта, Магілёўскай вобласці — 3,45 працэнта, бюджэт г. Мінска — 5,79 працэнта.

2. Пры размеркаванні даходаў, названых у пункце 1 гэтага артыкула, не ўлічваюцца падатак на прыбытак і падатак на дабаўленую вартасць, залічэнне якіх у рэспубліканскі бюджэт вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, а таксама падаткі, зборы (пошліны), якія выплачваюцца ў адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 28 гэтага Закона.

3. Даходы, названыя ў пункце 1 гэтага артыкула, размяркоўваюцца Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь з улікам палажэнняў пункта 2 гэтага артыкула паміж бюджэтамі розных узроўняў па нарматывах адлічэнняў, вызначаных гэтым Законам і рашэннямі абласных Саветаў дэпутатаў пры зацвярджэнні адпаведных мясцовых бюджэтаў.

**Артыкул 5.** Зацвердзіць на 2011 год:

даходы рэспубліканскага бюджэту ў суме 33 611 384 915 тыс. рублёў згодна з дадаткам 2;

выдаткі рэспубліканскага бюджэту ў суме 39 611 384 915 тыс. рублёў па функцыянальнай класіфікацыі выдаткаў бюджэту па раздзелах, падраздзелах і відах выдаткаў згодна з дадаткам 3;

размеркаванне бюджэтных прызначэнняў па распарадчыках бюджэтных сродкаў у адпаведнасці з ведамаснай класіфікацыяй выдаткаў рэспубліканскага бюджэту і функцыянальнай класіфікацыяй выдаткаў бюджэту згодна з дадаткам 4;

пералік бюджэтных праграм, фінансаванне якіх прадугледжваецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту (без уліку сродкаў на фінансаванне дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы), згодна з дадаткам 5;

выдаткі рэспубліканскага бюджэту на фінансаванне дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы (без уліку рэзервовага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь) у суме 1 960 052 270 тыс. рублёў, у тым ліку сродкі дзяржаўнага мэтавага бюджэтнага фонду нацыянальнага развіцця ў суме 321 000 000 тыс. рублёў;

выдаткі рэспубліканскага бюджэту на навуковую, навукова-тэхнічную і інавацыйную дзейнасць па функцыянальнай класіфікацыі выдаткаў бюджэту па раздзелах, падраздзелах, відах выдаткаў, кірунках выкарыстання і заказчыках, распарадчыкам сродкаў у памеры 865 000 000 тыс. рублёў згодна з дадаткам 6.

**Артыкул 6.** Зацвердзіць памер абаротнай касавай наяўнасці па рэспубліканскім бюджэце на 1 студзеня 2012 года ў суме 130 000 000 тыс. рублёў.

**Артыкул 7.** У 2011 годзе перадаць з рэспубліканскага бюджэту ў кансалідаваныя бюджэты абласцей і бюджэт г. Мінска:

1. Датацыі ў парадку, вызначаным Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь, у суме 9 987 997 945 тыс. рублёў, у тым ліку Брэсцкай вобласці — 1 777 916 054 тыс. рублёў, Віцебскай — 1 888 121 048 тыс. рублёў, Гомельскай — 1 785 576 724 тыс. рублёў, Гродзенскай — 1 442 999 772 тыс. рублёў, Мінскай — 1 324 703 573 тыс. рублёў і Магілёўская вобласці — 1 768 680 774 тыс. рублёў.

2. Субвенцыі на фінансаванне расходаў па:

2.1. пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС у суме 981 124 288 тыс. рублёў, у тым ліку Брэсцкай вобласці — 88 522 165 тыс. рублёў, Віцебскай — 9 722 100 тыс. рублёў, Гомельскай — 632 380 280 тыс. рублёў, Гродзенскай — 17 261 075 тыс. рублёў, Мінскай — 36 624 560 тыс. рублёў, Магілёўскай вобласці — 150 169 900 тыс. рублёў і г. Мінска — 46 444 208 тыс. рублёў.

Названыя ў частцы першай гэтага падпункта субвенцыі накіроўваюцца на рэалізацыю мерапрыемстваў, прадугледжаных Законам Рэспублікі Беларусь ад 6 студзеня 2009 года «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2009 г., № 17, 2/1561), а таксама на мэтавыя мерапрыемствы па аднаўленні і развіцці рэгіёнаў, якія пацярпелі ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, і правядзенне абаронных мераў у аграпрамысловым комплексе;

2.2. індэксаваных жыллёвых квотах (імянных прыватызацыйных чэках «Жыллё») у суме 191 500 000 тыс. рублёў, у тым ліку Брэсцкай вобласці — 70 000 000 тыс. рублёў, Віцебскай — 16 200 000 тыс. рублёў, Гомельскай — 23 500 000 тыс. рублёў, Гродзенскай — 36 400 000 тыс. рублёў, Мінскай — 30 000 000 тыс. рублёў і Магілёўскай вобласці — 15 400 000 тыс. рублёў;

2.3. развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці, стварэнні дадатковай і развіцці дзейнай інфраструктуры вытворчых аб'ектаў аграпрамысловага комплексу ў суме 719 414 700 тыс. рублёў згодна з дадаткам 7.

Субвенцыі, названыя ў частцы першай гэтага падпункта, накіроўваюцца на развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці (у тым ліку на набыццё нафтапрадуктаў, правядзенне мерапрыемстваў па паляпшэнні ўрадлівасці глебы, пагашэнні крэдытаў банкаў, выдадзеных на гэтыя мэты, рамонт і набыццё сельскагаспадарчай тэхнікі для арганізацый, якія ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць па вытворчасці прадукцыі раслінаводства, жывёлагадоўлі, рыбаводства і пчалярства, выкананне гарантый, дазволеных мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі па крэдытах, выдадзеных банкамі Рэспублікі Беларусь на гэтыя мэты, пагашэнне бюджэтных крэдытаў, бюджэтных пазык, выдзеленых на названыя мэты), на добраўпарадкаванне тэрыторый механізаваных двароў, зернятокаў, жывёлаводчых комплексаў і фермаў, пад'ездаў да іх, а таксама на кампенсацыю часткі працэнтаў па крэдытах, выдадзеных банкамі ў адпаведнасці з рашэннямі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

3. Субвенцыі за кошт сродкаў дзяржаўнага мэтавага бюджэтнага фонду нацыянальнага развіцця на праектна-пошукавыя работы, рэканструкцыю і рамонт існуючых участкаў мясцовых аўтамабільных дарог, якія ўключаюцца ў склад аб'екта «Абход тэрыторыі Нацыянальнага парку «Белавежская пушча» на ўчастку Ваўкаставец — Свіслач», у суме 126 000 000 тыс. рублёў, у тым ліку Брэсцкай вобласці — 110 000 000 тыс. рублёў, Гродзенскай вобласці — 16 000 000 тыс. рублёў.

**Артыкул 8.** Устанавіць, што ў 2011 годзе:

сродкі рэспубліканскага бюджэту ў суме 1 249 910 197 тыс. рублёў, прадугледжаныя на развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці, рыбаводства і перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі, выкарыстоўваюцца па кірунках згодна з дадаткам 8;

нарматыўныя прававыя акты, прынятыя (выдадзеныя) да 2011 года і якія вызначаюць фінансаванне за кошт сродкаў рэспубліканскага фонду падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, харчу і аграрнай навукі, забяспечваюцца фінансаваннем у межах сродкаў, якія прадугледжваюцца ў рэспубліканскім бюджэце на сельскую гаспадарку, рыбагаспадарчую дзейнасць, а таксама ў адпаведнасці з падпунктам 2.3 пункта 2 артыкула 7, пунктам 6 артыкула 28 гэтага Закона.

**Артыкул 9.** Вызначыць, што ў 2011 годзе:

1. Даходы дзяржаўнага мэтавага бюджэтнага рэспубліканскага фонду аховы прыроды ўтвараюцца ў суме 146 190 398 тыс. рублёў і накіроўваюцца на расходы названага фонду ў суме 138 880 878 тыс. рублёў згодна з дадаткам 9, а таксама ў рэзервовы фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у памеры 5 працэнтаў ад даходаў гэтага фонду для мэтавага фінансавання мерапрыемстваў па сацыяльнай падтрымцы моладзі.

2. Даходы дзяржаўнага мэтавага бюджэтнага рэспубліканскага фонду аховы прыроды фарміруюцца за кошт:

экалагічнага падатку ў частцы плацяжоў, якія паступаюць у даход рэспубліканскага бюджэту за выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра, скідванне сцёкавых водаў, захоўванне, пахаванне адходаў вытворчасці, увоз на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь азонаразбуральных рэчываў, у тым ліку тых, што змяшчаюцца ў прадукцыі;

даходаў ад рэалізацыі канфіскаваных або іншым шляхам канфіскаваных у даход дзяржавы прылад паляванння і здабычы рыбы і іншых водных жывёлаў, а таксама ад продажу незаконна здабытай з дапамогай гэтых прылад прадукцыі;

пакрыццё шкоды, нанесенай навакольнаму асяроддзю;

іншых даходаў.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

# ЯК АТРЫМАЦЬ ТЭХНІЧНЫЯ СРОДКІ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Адначасова калі для інвалідаў I-II групы і дзяцей-інвалідаў патрэбныя слыхавыя апараты, пратэзы вачэй, кантактныя лінзы, лупы, зубныя пратэзы, інсулінавыя шпрыцы, тэст-палоскі для вызначэння цукру ў крыві, глюкометр ці стамійныя прылады, то месцам звароту павінны быць мясцовыя органы аховы здароўя.

## САМАСТОЙНА. АБО З ДАПАМОГАЙ

Першы неабходны дакумент — гэта індывідуальная праграма рэабілітацыі інваліда ці заключэнне ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі, заява і дакумент, які сведчыць асобу, або калі гаворка ідзе пра дзіця-інваліда — пасведчанне аб яго нараджэнні і дакумент, які сведчыць асобу бацькоў. Адначасова можа спатрэбіцца і іншае — скажам, пацверджанне права на льготы ці працоўная кніжка.

— Ёсць выпадкі, калі з-за стану здароўя падаць неабходныя дакументы інваліду цяжка, — кажа Ірына Дудка. — Тады зрабіць гэта могуць сваякі. Або, як варыянт, можна звярнуцца ў раённы тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

## ПРА АПЛАТУ ЛЕПШ УДАКЛАДНІЦЬ НА МЕСЦЫ

Аплата за сродкі тэхнічнай рэабілітацыі — тэма асобная. Паводле заканадаўства, яны могуць прадастаўляцца за 50 працэнтаў, 25 працэнтаў, за 20 працэнтаў ад сабекошту або ўвогуле бясплатна.

— У прыватнасці, тэхнічнымі сродкамі рэабілітацыі забяспечваюцца Героі Беларусі і Савецкага Саюза, Героі Сацыялістычнай Працы, поўныя кавалеры ордэнаў Айчыны, Славы, Працоўнай Славы, інваліды і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, працаўнікі тылу, якія былі ўзнагароджаныя ордэнамі ці медалямі, і некаторыя іншыя катэгорыі, — паведамляе Ірына Дудка. — Зрэшты, варта заўважыць: удакладніць умовы аплаты ў кожным канкрэтным выпадку лепш за ўсё ў раённым упраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне або ў сталіцы — у раённым упраўленні сацыяльнай абароны.

## У КРАЙНІМ ВЫПАДКУ — РАМОНТ

Трэба мець на ўвазе, што кожны сродак тэхнічнай рэабілітацыі мае свой тэрмін выкарыстання: напрыклад, той жа пратэз кісці выдаецца на 6 месяцаў, а крэсла-каляска — на 5 гадоў.

— Пяць гадоў — тэрмін вельмі вялікі, і на працягу яго можа здарыцца ўсё, — зазначае Ірына Дудка. — Таму для большасці тэхнічных сродкаў рэабілітацыі прадугледжана магчымасць рамонту. Прычым вызначана, што буйны рамонт павінен быць праведзены не больш чым за 30, сярэдні рамонт — не больш чым за 15, а дробны — не больш чым за 7 працоўных дзён.

## ДАХОДЫ НЕ МАЮЦЬ ЗНАЧЭННЯ

І колькі слоў пра інвалідаў III групы і дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, якія інвалідамі не з'яўляюцца, але па заключэнні медыкаў маюць патрэбу ў тэхнічных сродках рэабілітацыі. Атрымаць неабходныя дапаможныя сродкі гэтыя катэгорыі могуць праз праграму адраснай сацыяльнай дапамогі.

— Звярнуцца па адрасную сацыяльную дапамогу на тэхнічныя сродкі рэабілітацыі ў такім выпадку можна ў раённае ўпраўленне сацыяльнай абароны, — адзначае Ірына Дудка. — Гэта дапамога прадастаўляецца без уліку даходаў, праўда, у розных формах. Так, для атрымання пратэзаў верхніх і ніжніх канечнасцяў у камплекце з чахламі, артэзаў верхніх і ніжніх канечнасцяў (апараты, тутары), артэзаў тулава (гарсэты, бандажы, спінагалоўтрымальнікі), вырабаў лячэбнага пратэзавання дзяцей (абдукцыйныя трусікі, распоркі) і артапедычнага абутку выкарыстоўваецца безнаяўная форма — пералічэнне грошай на рахунак прадпрыемства-вытворцы. А вось для забеспячэння слыхавымі апаратамі, пратэзамі вачэй, інсулінавымі шпрыцамі, тэст-палоскамі для вызначэння цукру ў крыві выдаюцца грошы «на рукі» — набываць усё гэта неабходна самастойна.

Прычым сама дапамога тут зноў жа прадастаўляецца з улікам тэрмінаў эксплуатацыі сродкаў рэабілітацыі. Напрыклад, для пратэзаў верхніх і ніжкіх канечнасцяў і артэзаў верхніх і ніжніх канечнасцяў, а таксама для артэзаў тулава для дарослых гэты тэрмін складае 2 гады, для дзіцячых артэзаў верхніх і ніжніх канечнасцяў, дзіцячых артэзаў тулава, вырабаў лячэбнага пратэзавання і артапедычнага абутку — 1 год, для дарослых слыхавых апаратаў — 4 гады, дзіцячых слыхавых апаратаў — 2 гады, пратэзаў вачэй — 1 год. Нарэшце, трэба мець на ўвазе: выплаты на інсулінавыя шпрыцы і тэст-палоскі для вызначэння цукру ў крыві робяцца з разліку набыцця аднаго вырабу ў суткі.

**Сяргей ГРЫБ.**

## Факт

### РАТАВАННЕ НЕАСЦЯРОЖНЫХ КУРЫЛЬШЧЫКАЎ

**Толькі за адзін дзень 17 кастрычніка падраздзяленні МНС Магілёўскай вобласці выратавалі на пажарах 4 чалавекі.**

Як паведаміў **прэс-сакратар Магілёўскага УМНС Юрый МЯТЛІЦКІ**, у нядзелю а 16-й гадзіне ў вёсцы Сяргеевічы Кіраўскага раёна ў сваёй хаце ледзь не загінуў у пажары 64-гадовы пенсіянер. Яго выратавала 58-гадовая суседка — яна па-сяброўску апякуе адзінокага мужчыну, які дрэнна ходзіць. Жанчына прыйшла наведаць суседа, але ўбачыла дым. Яна забегла ў хату і выцягнула мужчыну, якога потым шпіталізавалі з апёкамі ў Кіраўскую раённую бальніцу. Паводле МНС, мяркуемая прычына пажару — неасцярожнасць пры паленні.

Увечары ў нядзелю ў Бабруйску давялося эвакуяваць 17 чалавек, калі пачаўся пажар ў 9-павярховым доме на праспекце Будаўнікоў. Супрацоўнікі МНС выратавалі гаспадыню кватэры на 3-м паверсе, адзінокую пенсіянерку і, паводле папярэдняй версіі, таксама неасцярожную курыльшчыцу. Жанчына з атручэннем прадуктамі гарэння трапіла ў бальніцу.

У Асіповічах позна ўвечары 17 кастрычніка пажар у 3-пакаёвай кватэры напаткаў цэлую кампанію, якая там адпачывала. Гаспадар кватэры і два яго сябры паспелі пакінуць задымлены дом яшчэ да прыезду выратавальнікаў, але паведамілі ім, што ўнутры знаходзяцца людзі. Супрацоўнікі МНС вынеслі з кватэры 50-гадовага мужчыну і 46-гадовую жанчыну, якая заснула прама з цыгарэтай у руцэ. Пацярпелыя шпіталізаваныя: мужчына атруціўся прадуктамі гарэння, а жанчына атрымала апёкі.

### ПАЦЯРПЕЛІ 2 ЧАЛАВЕКІ І 4 АЎТАМАБІЛІ

**18 кастрычніка ў Магілёве адбылася буйная аварыя. Як паведамілі ў Магілёўскай ДАІ, удзень на скрыжаванні вуліцы Астроўскага і праспекта Шмідта сутыкнуліся аўтамабіль «Нісан» і таксі «Опель». Ад моцнага ўдару «Нісан» панесла: аўтамабіль збіў жанчыну-пешахода, затым ударыўся ў «Мерседэс», які стаяў на скрыжаванні, а той, у сваю чаргу, адкаціўся на суседні «Рэно».**

Які з аўтамабіляў парушыў правілы дарожнага руху і праехаў на чырвонае святло, устанаўлівае следства. Жанчына і вадзіцель «Нісана» моцна пацярпелі і шпіталізаваныя ў рэанімацыю бальніцы.

**Ілона ІВАНОВА.**

### ФІРМЫ ЦЕРПЯЦЬ ЗА МЕТАЛ

З тэрыторыі, дзе знаходзіўся ўчастак адной з прыватнай фірмаў, якая займалася вытворчасцю лакафарбавых матэрыялаў у пасёлку Вішанскі Гомельскага раёна, нечакана знікла каштоўнае абсталяванне, якое, апроч усяго, з'яўлялася і металаёмістым. Як расказалі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, праз некалькі дзён высветлілася, што станкі вывез, папярэдне распілаваўшы, кіраўнік іншай фірмы, якая займаецца скупкай металу на металалом. Па словах затрыманага, ён лічыў, што абсталяванне не мае гаспадара і нікому не патрэбнае.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# НЕ ЗНІКЛІ БЕЗ ВЕСТАК, А ЗАГІНУЛІ Ў ПАЛОНЕ

**Арганізаваная Камітэтам дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь і Брэсцкім аблвыканкамам сустрэча ўдзельнікаў міжнароднага даследчага праекта «Савецкія і нямецкія ваеннапалонныя і інтэрнаваныя» са сваякамі савецкіх ваеннапалонных, якія загінулі ў фашысцкім палоне, адбылася ў Брэсце. Падобныя сустрэчы прайшлі ў папярэднія гады ў Магілёве, Віцебску, Мінску і Гомелі.**



Сваякі загінулых атрымалі копіі архіўных дакументаў з інфармацыяй пра дату смерці і месцах пахаванняў іх блізкіх. Супрацоўнікі цэнтральнага архіва КДБ і нямецкія даследчыкі сабралі звесткі пра больш як 800 загінулых ваеннапалонных — ураджэнцаў Брэсцкай вобласці. Многія з іх дагэтуль лічыліся зніклымі без вестак. У цэнтральны архіў Камітэта і Упраўленне КДБ Рэспублікі Беларусь па Брэсцкай вобласці звярнуліся больш за 60 жыхароў рэспублікі. Яны ўпершыню атрымалі інфармацыю пра лёс сваіх блізкіх.

Дагавор паміж Камітэтам дзяржбяспекі і Аб'яднаннем «Саксонскія мемарыялы» аб сумесным вывучэнні архіўных дакументаў перыяду Другой сусветнай вайны быў падпісаны яшчэ ў 2002 годзе. З таго моманту Беларусь стала паўнапраўным удзельнікам міжнароднага даследчага, падтрыманага федэральным урадам Германіі праекта па ўстанаўленні лёсу ваеннапалонных і месцаў іх пахаванняў. Беларускія даследчыкі апрацавалі звыш 24 тысяч трафейных нямецкіх картак на 14 тысяч ваеннапалонных — ураджэнцаў Беларусі. Праца над праектам працягваецца.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Абзац

◢ Тры чалавекі загінулі на чыгуначных пуцях Беларусі ў мінулыя выхадныя. Так, 16 кастрычніка на 68-м км перагона Цёмны Лес—Пагодзіна (Дрыбінскі раён) дызель-цягніком быў смяротна траўмаваны 32-гадовы жыхар Горак. У той жа дзень на 745-м км прыпыначнага пункта Трактарны загінуў 34-гадовы жыхар Белаазёрска Бярозаўскага раёна. А 17 кастрычніка на 670-м км станцыі Барысаў грузавым цягніком Орша—Мінск быў смяротна траўмаваны 35-гадовы ўраджэнец Барысава без пэўнага месца жыхарства.

◢ **Два невядомыя зламыснікі напалі на сям'ю бабруйчан. Выставіўшы аконную шыбу, яны залезлі ў дом у 2 гадзіны ночы. Хаваючыся пад шапкамі з прарэхамі для вачэй і пагражаючы нажом, зламыснікі звязалі 61-гадовую жанчыну і яе мужа, скралі Br9 млн і больш за $300. Яны забралі таксама залатыя вырабы — заручальны пярсцёнак, тры пячаткі, два бранзалеты і крыжык. Вядзецца следства.**

◢ Каліфарніец памёр ад удару мячом для гольфа ў галаву. Няшчасны выпадак адбыўся ў Паўднёвай Каліфорніі падчас гульні. 69-гадовы Хіросі Танга памёр ад удару мячом у галаву. Праўда, паміж ударам і смерцю мінула дзевяць дзён. Танга сам пакінуў поле, але пазней звярнуўся ў лякарню са скаргамі на болі ў галаве і шыі. Нягледзячы на намаганні лекараў, гальфіст памёр ад атрыманых траўмаў.

## Поўны абзац

◢ **Брытанскі ювелір Сцюарт Х'юз, вядомы як дызайнер рознага кшталту эксклюзіўных і звышдарагіх мадэляў электронных прыстасаванняў, вырабіў самы дарагі ў свеце мабільны тэлефон коштам $8 млн. Базай для яго стаў iPhone, які выпускае кампанія Apple. Зроблены з ружовага золата тэлефон упрыгожаны 500 брыльянтамі, агульная вага якіх перавышае 100 карат. Паверх адной з кнопак будзе пастаўлены ружовы брыльянт 7,4 карата, альбо 8-каратны празрысты дыямент. Як паведамляецца, С. Х'юз зробіць 2 такія тэлефоны на замову багатых аўстралійскіх бізнэсоўцаў.**

◢ У Падмаскоўі супрацоўніца Ашчадбанка памылкова выдала ў абмен на 2 тыс. долараў суму ў рублях, эквівалентную 20 тыс. долараў ЗША. Касірка звярнулася ў міліцыю з заявай пра вышук мужчыны, якому яна ў абменным пункце валюты выдала вялікую суму грошай. Было ўстаноўлена, што ўраджэнец Рэспублікі Арменія прыйшоў у абменны пункт і памяняў валюту. З-за няўважлівасці касіркі сума прычыненага ўрону склала больш за 500 тыс. рублёў. Мужчына быў затрыманы міліцыяй і дастаўлены ў АУС для разбору. Ён патлумачыў, што не меў намеру скрасці грошы, памылку касіркі выявіў нядаўна і хацеў вярнуць пераплачанае. Тым не менш заведзена крымінальная справа.



◢ **Сямейная пара са штата Мічыган (ЗША) вызначылася тым, што сваіх траіх дзяцей нарадзіла 08.08.08, 09.09.09, 10.10.10. Першая дачка Чада і Барбі Сопер нарадзілася 8 жніўня 2008 года. Праз год і месяц, а менавіта 9 верасня 2009 года, на свет з'явіўся сын Камерон. А сёлета сямейства папоўнілася яшчэ адной дзяўчынкай — дачкой Кірай, якая нарадзілася 10 кастрычніка.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.10.2010 г. (для б/н разлікаў) | | | |
|---|---|---|---|
| ▲1 долар ЗША | 3 000,00 | 1 чэшская крона | 169,22 |
| ▼1 еўра | 4 164,60 | 1 польскі злоты | 1057,14 |
| 1 латвійскі лат | 5 851,95 | ▼1 расійскі рубель | 98,28 |
| 1 літоўскі літ | 1 202,60 | 1 украінская грыўня | 377,55 |

| Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ | |
|---|---|
| USD | 30,5237 |
| 10 UAH | 38,4091 |
| 1000 BYR | 10,1950 |
| EUR | 42,3577 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

**Открытое акционерное общество «Управление механизации № 79»**

**ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ 29 ОКТЯБРЯ 2010 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

**Повестка дня:**

1. Приобретение Обществом в 2010 году башенных кранов.
2. Заключение кредитных договоров для оплаты за полуприцепы и за башенные краны, а также заключение договоров залога в связи с этим.
3. Об одобрении ранее заключенных в 2010 году с филиалом 500-Минским управлением ОАО «АСБ Беларусбанк» кредитных договоров.
4. Об оказании спонсорской помощи Министерству архитектуры и строительства Республики Беларусь.

Место проведения собрания — ***г. Минск, ул. Селицкого, 27/2, 3-й этаж, кабинет отдела техники безопасности.***

Время начала проведения собрания — ***16.00.***

Время регистрации участников собрания — ***в день проведения собрания с 15.00 до 15.45 по предъявлению документа, удостоверяющего личность, а представителей акционеров — и доверенности.***

Время и место ознакомления акционерами с материалами по вопросам повестки дня собрания — в рабочие дни, начиная с 19 октября 2010 г. по месту нахождения Общества с 13.00 до 17.00, в день проведения собрания — по месту проведения собрания до 15.00.

УНП 100090613

*Наблюдательный Совет.*

Тыдзень маці

# НІ КРОКУ ДА СТАРАСЦІ, А ЖЫЦЦЬ ТОЛЬКІ Ў РАДАСЦІ!

## Або Добры дом Добрусевых

**Валянціна Добрусева змяніла педагагічную дзейнасць на прафесію маці. У дзіцячым доме сямейнага тыпу, адзіным у Крычаўскім раёне, цяпер гадуюцца 8 дзяцей.**

Прыгожы дамок на ўскрайку аграгарадка Касцюшкавічы. Ля брамкі драўляны чалавечак у гумовых ботах і з парасонам нібыта вітае гасцей на вуліцы Палявой. Восеньскае сонца адлюстроўваецца ў садовай сажалцы, дзе ўлетку цвілі лілеі. Лялька ў сялянскай спадніцы, але ў модных аранжавых ботах, адной рукой схапілася за швабру, а другой — за калодзежнага жураўля. Відаць, сімвалізуе гаспадыню дома, якая праводзіць свае дні ў клопатах пра сям'ю і гаспадарку.

Валянціне Добрусевай 13 кастрычніка, напярэдадні Дня маці, споўнілася 39 гадоў. Яна родам з Касцюшкавічаў, працавала настаўніцай у мясцовай школе. Калі завочна паступіла ў Маскоўскі сацыяльны інстытут, стала сацыяльным педагогам і псіхолагам.

Па справах службы яна часта кантактавала з прыёмнымі дзецьмі і бацькамі, і аднойчы яе папрасілі пагутарыць з аднавяскоўцамі пра новую і перспектыўную форму выхавання дзяцей-сірот — дзіцячыя дамы сямейнага тыпу.

— І раптам я падумала: а чаму б самой не паспрабаваць, — узгадвае Валянціна падзеі 2002 года. — Муж Сяргей мяне падтрымаў. Мы паехалі ў Крычаўскую бальніцу, дзе ў інфекцыйным аддзяленні ляжалі такія дзеці. Паехалі па адно, а забралі адразу чацвярых.

Дзве сястры і два браты — сям'я Войтавых. Біялагічны тата памёр, а пазбаўленая бацькоўскіх правоў маці потым нарадзіла яшчэ адно дзіця, але да сваіх старэйшых дзяцей ніколі так і не прыехала.

Як ніколі не пацікавіліся лёсам сына біялагічныя бацькі Колі Бугаёва, самага малодшага ў сям'і. Яны жывуць зусім непадалёк ад Касцюшкавічаў, расказалі ў вёсцы, але нідзе не працуюць і п'юць горкую. Сам Коля паспяхова вучыцца ў 3 класе і задаволены сваёй новай сям'ёй.

Дашу Войтаву, якой у 2002 годзе было толькі 2 гады, аддаваць з бальніцы не хацелі. Дзяўчына была слабая і хваравітая, але Валянціна з мужам вырашылі, што здолеюць выхадзіць малую. Хоць яна дрэнна хадзіла і размаўляла, але шэфства над ёй узяла дачка Добрусевых Аляксандра. Цяпер Даша — аднакласніца і лепшая сяброўка Сашы. Дзве прыгажуні ўсё робяць разам. Дзяўчынкі — творчыя асобы, вучаніцы мастацкай і музычнай школ.

Іван — 12-гадовы брат Дашы. Вельмі добры хлопчык, ён мае добрых сяброў у Італіі. Яго адметнай рысай характару з'яўляецца жаль да кінутых жывёлін. Усе бадзячыя сабакі і няшчасныя каты ў вёсцы — яго асабісты клопат. Іван спрабаваў сфатаграфавацца з усімі сваімі махнатымі гадаванцамі, але не хапіла рук у хлопчыка і цярплівасці ў жывёл.



Даша і сялянка ў аранжавых ботах.

Старэйшы брат Івана, 16-гадовы Дзіма, цяпер вучыцца ў Крычаўскім ліцэі, паглыблена вывучае фізіку і матэматыку, каб падрыхтавацца да паступлення ў вышэйшую навучальную ўстанову. Ён прыязджае дадому толькі на выхадныя дні, як і старшы сын Добрусевых Ігар, які атрымлівае цяпер вельмі запатрабаваную прафесію кранаўшчыка ў Мсціслаўскім будаўнічым каледжы.

— Мы цяпер з мужам і не задумваемся — дзе свае дзеці, а дзе не свае, — гаворыць Валянціна. — Не будзем утойваць, што адаптацыя праходзіць нялёгка. Бо і нашым дзецям давялося навучыцца дзяліцца: і сваімі цацкамі, і ласункамі. А сёння ўсе 8 дзяцей — нашы. Я і думаць не хачу, што яны могуць з'ехаць і не вярнуцца. Я сама прыеду да іх, калі трэба будзе.




Валянціна ДОБРУСЕВА і яе дзеці.

Яшчэ ў сям'і жывуць дзве Ганны — старэйшая і малодшая. Старэйшай, Ганне Войтавай, споўнілася 15, і на наступны год яна таксама плануе паступіць у ліцэй, каб потым, з паглыбленымі ведамі ў біялогіі і хіміі, пайсці ў сферу медыцыны. Яе сяброўка — Ганначка Бяляцкая, якой 14 гадоў.

У цёплым доме Добрусевых шмат зеляніны. У дзіцячыя пакоі вядзе лесвіца, а на сценах — фотаздымкі дзяцей. Адзін, чорна-белы, вылучаецца з шэрагу: гэта фота самой Валянціны ў дзяцінстве. У дзіцячых пакоях ніякага творчага беспарадку, прычым чысціню забяспечваюць самі маленькія жыхары. Кухня вялікая, каб умясціць усіх едакоў: адной 7-літровай каструлі з супам хапае толькі на адзін сямейны абед. У склепе — больш за сотню слоікаў з кансерваванай агароднінай.

Каб выжываць, карміцца і апранацца, сям'я мае вялікую гаспадарку: тры каровы, свінні, птушкі. Добрусевы з дзецьмі апрацоўваюць зямельны ўчастак, які больш за гектар, таму набылі трактар і матаблок. Аднак Валянціна не ўтойвае, што да асабістай падсобнай гаспадаркі сямейнага дзіцячага дома людзі ставяцца па-рознаму.

— Тут ёсць два меркаванні, — уздыхае жанчына. — Адны ўхваляюць, бо мы за кошт гаспадаркі трымаемся на плаву: здаём малако, маем сваё мяса і яйкі. Але іншыя гэтага не разумеюць і гавораць, што я багацею на гаспадарцы, а дзеці на мяне батрачаць. Праўда, я ўжо прызвычаілася да такіх погаласак: маўляў, набралі дзяцей сабе дзеля грошай. Насамрэч, ніхто з дзіцячых дамоў, падобных нашаму, не азалаціўся. Мы ў крэдытах і клопатах, але дзяцей выгадуем.

Зусім не сакрэт, што грошай у вялікай сям'і вечна не хапае. Самая значная навала, гаворыць Валянціна, — гэта падрыхтоўка да 1 верасня, калі кожнае дзіця хочацца апрануць у новае ды моднае і набыць самыя лепшыя школьныя прылады. Сёлета гэта ўдалося зрабіць дзякуючы добраму ўраджаю бульбы: працавалі на палетках усёй сям'ёй і прадалі частку вырашчанага.

**ДАВЕДКА:**
***Цяпер у Магілёўскай вобласці працуе 31 дзіцячы дом сямейнага тыпу. Да канца года ў вобласці адкрыюцца яшчэ 3 падобныя дамы, для якіх пабудавана жыллё ў Магілёве, Бабруйску і ў вёсцы Гарадзец Шклоўскага раёна.***

— Я лічу, што мае дзеці не згубяцца ў жыцці, — настойвае маці. — Я за іх спакойная, таму што яны шмат ведаюць і ўмеюць рабіць усё. Я вось сяджу і не хвалююся за святочны стол, таму што мае Ганны прыйдуць са школы і мы разам нарэжам усе салаты. А ў суботу прыездзе Дзіма, які зробіць для ўсіх лазню. Калі я трапіла ў бальніцу, дзеці з мужам і маці дагледалі жывёлу, палолі градкі. І што ў гэтым дрэннага? Няўжо больш карысна каля тэлевізара днямі сядзець? Лепш нешта рабіць і ні ў каго не прасіць з працягнутай рукой ні яйка, ні сала, ні грошай. Так што я прывыкла: людзі могуць гаварыць, а мы жывём.

У гэтым жыцці няма месца звычайнаму адпачынку: дзеці ездзяць на аздараўленне, а бацькам трэба глядзець за гаспадаркай. Улетку — сена, увосень — дзіцячая вучоба, узімку — святы, увосень — сяўба. Так і бягуць гады.

— Добра было б адпачыць, — марыць Валянціна. — Мае суседкі скардзяцца, што дзеці выраслі і раз'ехаліся, а яны засталіся адны. Бядуюць адзінокімі вечарамі. А мне часам хочацца хоць некалькі гадзін пабыць адной: кніжку пачытаць, павязаць каля тэлевізара, але клопатамі запоўнены кожны дзень. Хоць сама разумею: як толькі застануся адна, так адразу з тугі і завыю!

Каб, відаць, ніколі не давялося завыць з тугі, Валянціна Добрусева стала яшчэ і дэпутатам. Народ выбраў яе ў Крычаўскі раённы Савет.

— Не магу жыць, калі спакойна,— смяецца яна. — Мне трэба хуценька рухацца. Інакш падаецца, што таўсцею і сумую. А вось калі плечы ад працы мокрыя, тады мне цікава жыць.

Усе дзеці аб'ядналіся і зрабілі Валянціне маляўнічую паштоўку на дзень нараджэння: «Ні кроку да старасці, ні гадзіны ў горасці, а толькі ў радасці, а толькі ў бадзёрасці». Імянінніца атрымала ад мужа грошы на падарунак, аднак паспяхова набыла на іх на рынку ў Крычаве цёплыя боты, штаны і шапкі для дзяцей. І ні пра што не шкадуе.

На святы ў Добрусевых — дзіцячы салодкі стол.

— Што трэба малым? Прыгалубіць, апрануць, накарміць. А калі ёсць садавіна і цукеркі, дык падаецца, што яны самыя шчаслівыя дзеці на свеце!

Адметнай рысай сапраўднай маці Добрусева лічыць дабрыню. А яшчэ больш за ўсё яна жадае ўсім маці здароўя. Часам, калі дзеці хварэюць, Валянціна, як і ўсе маці, думае: лепей бы сама, чым малое. Аднак калі аднойчы сапраўды захварэла сама і трапіла ў бальніцу, то стала страшна кінуць дзяцей, і замест вылячэння — усе думкі пра дом, дзяцей: што паелі, як пайшлі ў школу...

— Таму найперш здароўя, а таксама цярплівасці, грошай і ўдачы, — такія пажаданні з Касцюшкавічаў усім маці.

**Ілона ІВАНОВА.**
**Фота Ірыны САВОСІНАЙ.**
*Крычаўскі раён.*

## СВЯТА-ПАКРОЎСКАЙ ЦАРКВЕ СПОЎНІЛАСЯ 200 ГАДОЎ

У вёсцы Вейна Магілёўскага раёна 14 кастрычніка адзначылі 200-гадовы юбілей мясцовай царквы Пакрова Багародзіцы. У святочнай службе з нагоды двайнога свята, Пакрова і юбілею храма, браў удзел епіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі Сафроній. Каля царквы ўсталявалі памятны паклонны крыж.

Свята-Пакроўская царква, помнік архітэктуры, была пабудавана генералам Аляксеем Ярмолавым, вядомым военачальнікам і ўдзельнікам Барадзінскай бітвы. У Расійскім гістарычным архіве ў Санкт-Пецярбургу знойдзены дакумент аб Вейнянскім царкоўным прыходзе канца XIX — пачатку XX стагоддзя, дзе ўказваецца дакладная дата пабудовы храма — 1810 год. Нядаўна царкву абнавілі, упрыгожылі роспісам, добраўпарадкавалі, а таксама асвяцілі крыніцу каля храма.

**Ілона ІВАНОВА.**

# ГАРАЖ



**— гэта не толькі дах для аўтамашыны, ён стаў для многіх жыхароў неад'емнай часткай іх жыцця. Гаражнымі масівамі акружаныя нашы гарады, і без іх ужо цяжка ўявіць пейзаж гарадскіх ускраін**

У мяне гараж усяго 8 гадоў (да гэтага здымаў), а нехта гараж мае не адно дзесяцігоддзе.

Сёння шмат гаражоў зачынена і гаспадары іх наведваюцца вельмі рэдка, тым не меней жыццё ў гаражных масівах віруе.

У некаторых гаражах адкрыты майстэрні і каля іх стаяць аўтамашыны — зыркае зварка, мітусяцца людзі.

А хтосьці ператварыў гараж у склад. У ім машына не стаіць, а ляжыць нейкі тавар ці захоўваюцца запасы гародніны на зіму.

Неяк ноччу прыйшоў да свайго гаража (прыйшло ў галаву, што замок не павесіў) і ўбачыў, што ў адным гаражы гарыць святло і чуецца смех, а каля другога стаіць машына і з яе нешта выгружаюць.

Вельмі часта гаражы становяцца месцам для ўцех. І здараецца, тыя спатканні сумна заканчваюцца. Зачыніліся ў гаражы, селі ў аўтамашыну, выпілі пад музыку, завялі рухавік, каб цяплей было, і... у газеце друкуецца спачуванне сям'і.

Тут не толькі паміраюць, але могуць і нарадзіцца. Мужчына прыехаў з цяжарнай жонкай у гараж, залез за нечым у падвал, а вылез — трэба роды прымаць.

Адным словам, у гаражах нараджаюцца, паміраюць і жывуць — у прамым сэнсе гэтага слова.



За два блокі ад майго ў гаражы жыве пенсіянер. Нешта ў чалавека разладзілася з жонкай, дык ён перайшоў жыць у гараж. Адгарадзіў у ім закутак, каб цяплей было, прыцягнуў са сметніка канапу і адчувае сабе камфартабельна нават зімой, бо абагравальніка дастаткова, каб падтрымліваць цяпло на некалькіх квадратных метрах. Праўда, энерганагляд турбуе і нават штрафаваў, але чалавек даволі мірны. Пенсію жонка забірае, а ён цягае металалом і нікому не перашкаджае — не горшы з людзей.

Некалькі гадоў таму ў адзін з гаражоў уварваліся спецназаўцы ў масках. Нешта адтуль вывозілі, кажуць, зброю шукалі, а неўзабаве пасля гэтага гаспадар памёр, бо яго сын у нечым там ублытаны быў. Бацька ж запомніўся неблагім чалавекам.

А часам нехта прыходзіць у гараж, як на працу. Вось дзверы ў гаражы Леаніда Міхана заўсёды прыадчыненыя. Да пенсіі ён працаваў дыспетчарам электрасетак раёна, і цяпер ён пастаянна ў сваім гаражы. А калі гаспадара на месцы няма, то здаецца, што чагосьці не хапае.

— *Гэта сёння кожны можа мець гараж, а за савецкім часам пабудаваць гараж было вялікай праблемай. Вось у мяне быў матацыкл з каляскай, то дазвол на будаўніцтва гаража не давалі,* — кажа мой суразмоўца.

— Леанід Аляксандравіч, вы ў сваім гаражы нават у выхадныя. Цягне сюды?

— *А што рабіць дома на пятым паверсе? Глядзець тэлевізар, то і здурнець можна. А так прыйдзеш, свежае паветра, людзі заходзяць ды і справай займаюся. Рамантую нейкія электрапрыборы, зрабіў дрэваапрацоўчы і свідравальны станкі, і час праходзіць. Трэба некаму дошку пагабляваць, то ідуць.*

Я прыкмеціў, што Л. Міхан заўсёды пры справе. Вось суседу дапамагае рубероідам гараж пакрыць, а другому нясе гаечныя ключы...

— Наліваюць? У нас, як правіла, чаркай разлічваюцца.

— *Выпіць пры выпадку, то чаму б і не, але ў меру.*

— А як жонка ставіцца да таго, што вы ўвесь час тут прападаеце?

— *Нашы дзеці ўладкаваныя, і з імі няма праблем, растуць унукі. Маю медаль «За працоўную доблесць», выдатнік энергетыкі СССР, а за гэта да пенсіі энергасеткі даплачваюць 78 тысяч рублёў, то што яшчэ трэба... А жонцы я кажу: «У цябе свае справы, а ў мяне свае». Так што тут вялікай праблемы няма.*

— Уявім на хвіліну, што вы засталіся без гаража. Прачнуліся раніцой, а ісці няма куды.

— *Думаю, што жыццё маё карацейшым стала б. Гэта забрала б некалькі гадоў. Ды не толькі я, а многія зжыліся з гаражамі — яны дапаўняюць жыццё чалавека. У некага ў сям'і не склалася, то час бавяць тут. Не, гараж — гэта цэлае жыццё. Тут радасці і смутак.*

І ў гэтым ёсць праўда. У гаражах весяляцца — летам, бывае, перад расчыненымі дзвярыма нехта варожыць над шашлыкамі ці далей ад вачэй, у глыбіні гаража, за чаркай ідзе ціхая размова.

Бывае і сумна, бо калі ў гаражы пабывалі зладзеі, то радавацца няма чаму. Здараліся і пажары.

Вось пад'ехаў на «масквічы» малады хлопец і пытаецца, ці няма старога акумулятара. Плацяць за кілаграм 300 рублёў. Акумулятар пацягне тысяч на пяць. Скупшчыкаў цікавіць свінец.

У гараж можа заглянуць вяртлявы мужычок з пакетам і прапанаваць па вельмі нізкай цане нейкі інструмент, не інакш як крадзены.

А з надыходам зімы гаражнае жыццё пакрысе замірае. Многія гаражы занясе, да другіх снег будзе расчышчаны, бо бульбу дастаць трэба. А наступіць вясна — і ўсё ажыве, вернецца на кругі свае.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.**

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

## «ТАРЫФЫ НА ПЛАТНЫЯ МЕДЫЦЫНСКІЯ ПАСЛУГІ Ў НАС НІЖЭЙШЫЯ, ЧЫМ У ІНШЫХ РАЁНАХ»

**Чытач з Чэрвеньскага раёна папрасіў расказаць пра платныя медыцынскія паслугі. Ніякіх прамых скаргаў з яго боку не прагучала, хаця было відавочна, што ён імкнецца параўноўваць інфармацыю па розных абласцях. Канкрэтныя пытанні прагучалі так: якія паслугі падлягаюць аплаце, чым увядзенне аплаты абумоўленае, хто ўстанаўлівае канкрэтныя тарыфы?**

Дапамагчы даць такі ж агульны адказ на запыт заяўніка дапамагла **намеснік галоўнага бухгалтара па эканамічнай працы ўстановы аховы здароўя «Чэрвеньская цэнтральная раённая бальніца» Валянціна ГАРНЯКОВА**.

— Існуе пастанова Савета Міністраў № 142 ад 1 лютага 2010 года, якая рэгламентуе пералік платных медыцынскіх паслуг для грамадзян Рэспублікі Беларусь. Гэты пералік уключае ў сябе 37 пунктаў. Калі гаварыць канкрэтна пра наш Чэрвеньскі раён, дык мы аказваем 22 віды платных медыцынскіх паслуг, — распавяла Валянціна Ягораўна. — Калі чытач імкнецца параўноўваць тарыфы ў розных рэгіёнах, мушу падкрэсліць, што ў нас яны значна ніжэйшыя, чым у іншых раёнах. Чаму так? Рэч у тым, што дзейнічае агульны прынцып: раз колькасць насельніцтва канкрэтнага раёна невялікая, значыць, медыцынскія работнікі з яго належаць да групы з меншай аплатай працы. Сёння ў раёне пражывае 33 тысячы чалавек, што само па сабе няшмат, да таго ж колькасць насельніцтва пакрысе зніжаецца.

Як разлічваюцца канкрэтныя тарыфы на аказанне платных медыцынскіх паслуг? Валянціна Гарнякова патлумачыла: на падставе пастановы Міністэрства аховы здароўя № 51 ад 22 снежня 2003 года — зыходзячы з дзейных выдаткаў — зарплата медыцынскім работнікам; (колькі якіх работнікаў і з якой канкрэтна катэгорыяй — па раёнах, вядома, лічбы адрозніваюцца), аплата паслуг жыллёва-камунальнай гаспадаркі, накладныя выдаткі і інш. Разлічаныя па такім алгарытме тарыфы накіроўваюцца на разгляд ва ўпраўленне аховы здароўя Мінаблвыканкама і Міністэрства аховы здароўя, дзе пераправяраюцца і толькі пасля гэтага ўзгадняюцца і накіроўваюцца назад да выканання.

— Штомесяц дазваляецца павялічваць на 0,9 працэнта дзейныя тарыфы — каб не было рэзкага іх росту адначасова. Жыццё ж таксама пакрысе даражэе, так? І такія пераразлікі мы рэгулярна праводзім у адпаведнасці з інструкцыяй, — дадала Валянціна Ягораўна.

Вяртаючыся да пераліку платных медыцынскіх паслуг, якія аказваюцца медыцынскімі ўстановамі на тэрыторыі Чэрвеньскага раёна, нагадаем — іх 22. Гэта, у прыватнасці, стаматалагічныя, зубапратэзныя, паслугі нетрадыцыйнай медыцыны, УГД, масаж, правядзенне прафаглядаў і іншыя.

— Усё гэта запатрабавана насельніцтвам. Але асаблівым попытам карыстаюцца платныя стаматалагічныя паслугі. Іх удзельная вага ў агульным аб'ёме складае 40 працэнтаў. Далей ідуць паслугі па прафаглядах — або ў прадпрыемстваў, або ў грамадзян пры працаўладкаванні, у вадзіцеляў у тым ліку, — расказвае далей суразмоўца.

Дарэчы, за дзевяць месяцаў Чэрвеньская цэнтральная раённая бальніца атрымала ад аказання платных медыцынскіх паслуг 312 мільёнаў рублёў, што Валянціна Гарнякова называе неблагім паказчыкам. І тут жа дадае, што перад медыкамі пастаўленая задача: да канца года павялічыць аб'ём аказання платных медыцынскіх паслуг у параўнанні з вынікамі мінулага года на чвэрць...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Ну і ну!

### ДЗЯЎЧАТЫ АБРАБАВАЛІ СЕЛЬСКУЮ КРАМУ

У Шаркоўшчынскім раёне ў вёсцы Запруддзе ноччу абрабавалі краму спажывецкай кааперацыі. Адключылі электрычную праводку, якая вядзе да гукавой сігналізацыі, узламалі дзвярныя запоры... Скралі прадукты харчавання, віна-гарэлачныя вырабы і цыгарэты агульным коштам больш за 4,1 мільёна рублёў. Міліцыянеры высветлілі, што рабаўніцтва крамы — справа рук дзвюх дзяўчат. Адной усяго 17 гадоў, яна навучэнка, другой, беспрацоўнай, 18. Абедзве мясцовыя жыхаркі.

### З ПОЛЯ ТЭХАСА СКРАЛІ КАПУСТУ

У Віцебскі раённы аддзел унутраных спраў старшыня фермерскай гаспадаркі пад даволі запамінальнай назвай «Тэхас-М» паведаміла, што з поля гаспадаркі ўвечары скралі больш за 300 кілаграмаў капусты. Поле знаходзіцца ў прыгарадзе абласнога цэнтра ля населенага пункта Тулава. Страту ў гаспадарцы ацанілі ў 614 тысяч рублёў. «Тэхас» пакінула без капусты 48-гадовая беспрацоўная жыхарка Віцебска. Заведзена крымінальная справа. Высвятляюцца ўсе нюансы незвычайнага крадзяжу. Як жанчына здолела скрасці столькі капусты, хто дапамагаў ёй — следчыя разбяруцца.

### ПОЛЬСКІ КІРОЎЦА ЗАСТАЎСЯ БЕЗ ГРОШАЙ

У Віцебску ў міліцыю па дапамогу звярнуўся грамадзянін Польшчы, кіроўца. Іншаземец паскардзіўся на тое, што ноччу ў кавярні «Тэатральная» ў яго скралі партманет — 350 долараў, 150 еўра і вадзіцельскія дакументы. Міліцыянеры ўстанавілі, што без грошай і дакументаў польскага кіроўцу пакінуў 26-гадовы раней судзімы за крадзеж мясцовы жыхар.

### «БЕДНЫЯ» БІЗНЭСМЕНЫ, «БАГАТЫЯ» АГРАРЫІ?

У Віцебскай вобласці з пачатку года па верасень падатковыя органы спагналі ў бюджэт 229,7 мільярда рублёў. А гэта ажно 7,6 працэнта ад агульнай сумы бюджэтных паступленняў дзевяці месяцаў... Цікава, што больш за 3,2 мільярда рублёў запазычанасці пагасілі за кошт канфіскацыі ў даўжнікоў наяўных грошай.

Па звестках на пачатак кастрычніка агульная запазычанасць плацельшчыкаў перад бюджэтам склала 7,5 мільярда рублёў. Пераважна запазычылі юрыдычныя асобы (7,2 мільярда рублёў). Спраўна плацяць падаткі дзяржаўныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы і сельскагаспадарчыя вытворчыя кааператывы. А вось агульны доўг індывідуальных прадпрымальнікаў на пачатак гэтага месяца склаў 210,2 мільёна рублёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# СУБОТНЯЯ АСВЕЯ



**У СТАРАЖЫТНАСЦІ ў Асвеі двойчы на год праводзіліся кірмашы — 2 мая і 28 чэрвеня. Наогул, праз гэты куточак на беразе Асвейскага возера, другога па велічыні возера ў Беларусі, праходзілі гандлёвыя шляхі з Расіі ў Прыбалтыку, Прусію і поўнач Еўропы. Цяпер пра багатае кірмашовае мінулае самага паўночнага гарадскога пасёлка краіны сведчаць некалькі сціплых радкоў у энцыклапедычным даведніку. Пятнічныя штотыднёвыя кірмашы ніякага дачынення да старажытнасці не маюць, але сведчаць, што гандаль — у крыві асвейцаў. Сучасныя ж восеньскія, як гэты, кірмашы, якія прыпадаюць на адну з першых субот кастрычніка, — традыцыя ўсяго з чатырохгадовым стажам. Магчыма, у будучым і яна будзе працягвацца без загаду зверху.**







Але павінна быць прывязка да якой-небудзь канкрэтнай даты, гістарычнай падзеі ці царкоўнага свята. Як гэта было ў мінулым. Бо вялікі традыцыйны кірмаш — гэта свята.

...Даволі бойка прадавалася ўсё, што прапаноўвалі прыватныя і дзяржаўныя гандляры — капуста, бульба, кветкі і саджанцы, свежае мяса і праца руплівых пчаляроў — мёд. З вёскі Стралкі на невялікі Асвейскі кірмаш прывезлі сваіх гадаванцаў спецыялісты па развядзенні парсючкоў. Асабліва здзівіў пакупнікоў садавод з Мёраў, які выставіў у якасці тавару і рэкламы гатункі малін у місцы, прадэманстраваўшы апетытны ўраджай чырвоных ягад. Яго калекцыя вінаграду — максама дзіва: амаль 50 гатункаў вырошчвае на сваім падвор'і.

Сярод удзельнікаў кірмашу на асвейскім беразе былі і два нашыя сталыя і даўнія падпісчыкі — Пётр Каськовіч і Зінаіда Зашчырынская — жыхары вёскі Стралкі. Зінаіда Ігнацьеўна — былы заатэхнік, цяпер на пенсіі, гадуе на продаж свінак. А ў Пятра Пятровіча Каськовіча пенсійнае хобі — пчалярства. Ён быў настаўнік фізікі і матэматыкі, і выручаныя за мёд грошы — неблагі дадатак да настаўніцкай пенсіі.

— «Звязда» ў нашых дамах прапісалася надоўга, — запэўнілі мяне Зінаіда і Пётр.

Восеньскі кірмаш нагадваў святочнае месца ўжо таму, што самадзейныя артысты з навакольных вёсак гучна дэманстравалі наведнікам сваё спеўнае мастацтва. Асабліва зладжана выводзілі спявачкі з вёскі Сенькава. Недарэмна гэтаму калектыву і нададзена званне народнага.

— Ведаеце, насельніцтва Асвеі задаволена, што і ў нас з'явіліся восеньскія гароднінныя кірмашы, — сказала старшыня Асвейскага сельскага Савета Валянціна Гаманько. Сама ж яна набыла ў гэты дзень два вялікія кусты кветак, каб свой дом і прысядзібны ўчастак зрабіць яшчэ больш прывабнымі.




**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.** *г.п. Асвея.*

Простая мова

# «УСЁ, ШТО ТЫ РОБІШ ДЛЯ ІНШЫХ...»

**Думка прыходзіла... Ды такая ж прыгожая!.. Хвілін колькі пакруцілася (не інакш, каб паказацца... З усіх бакоў), а потым убачыла, што яе не запісваюць, не «здымаюць» і пакрыўдзілася — сышла.**

**Маючы надзею, што гэта ненадоўга, што яна вернецца, завяла адмысловы нататнік асадку, аднак...**

**Іншыя думкі прыходзяць, а тая — не.**

**З форсам, бач...**

**Як і ўсе прыгожыя.**

## БЕЗ ПАМЫЛАК!

Рытм жыцця: ранак, вечар, Новы год.

То ранак. Тралейбус. Здалёк убачыла — 41-ы, дагнала, села, уткнулася ў кнігу. Прыпынкаў праз пяць зглядзела, што еду... зусім не туды, бо памылілася — гэта 49-ы...

Вечар, вольніца. На лавачцы ля пад'езда — купка падлеткаў: п'юць піва, пакурваюць (зусім як вялікія), шукаюць забаў.

— Девушка, посидите с нами, — запрашаюць сваю равесніцу, што шыбуе міма.

— В другой раз, — усміхаецца тая.

— Ну так номерок телефона оставьте — хоть приблизительный...

Дзяўчынка пырскае смехам і... запыняецца. Запыняецца (што цалкам магчыма), каб потым нікаму з гэтых хлапцоў пакінуць нумарок тэлефона. Прычым дакладны! Бо падман ён і ёсць падман; і памылка ў лічбах (нават на адну адзіначку!), як той узгаданы тралейбус — павязе зусім не туды.

## АД УСМЕШКІ...

Каляжанка чалавек абачлівы: загадзя, да наступлення халадоў зняла з антрэсоляў боты, выцягнула з шафы цёплыя спадніцы ды кофты, штось памерала, папрасавала, а ўбачыўшы на тэрмометры першы мінус, ужо і прыбралася — ва ўсё гатовае... Каб на працу ісці.

Муж з-за спіны спытаў: «Ты што — сягоння на бульбу?»

Яна засмяялася.

І абое ў люстэрку ўвачавідкі ўбачылі, як упрыгожыўся твар! І як ажыў, зайграў, паднядзеліўся самы будзённы строй! Ды ў такім... у тэатр можна!

...Хтось пісаў, што гэта, на жаль, складана — надзець на іншых сваю ўсмешку.

Як і потым насіць.

## АДНЫМ БОЛЕЙ...

У калгасе ў той год, лічы, не плацілі, і маці, каб накарміць, адзець і выправіць у школу дзяцей, стала гнаць самагонку.

Попыт на яе ў ваколіцах быў, прычым досыць вялікі, а пайшла прапанова...

Нехта оптам браў на нейкую бяседу (альбо каб потым пакрысе прадаваць у розніцу), нехта прыходзіў да «апарата» двойчы і тройчы на дзень, нехта — зрэдчас, па патрэбе...

Яна прадавала ўсім: бабам, падлеткам, хворым. Абы грошы... Можна і ў доўг...

«Уймися! Пабойся Бога, — умольвалі яе мацяркі ды жонкі, — не спойвай людзей, не губі!». Яна ў адказ хіба ўсміхалася: разумныя, маўляў, піць не будуць, а дурні ды алкаголікі — халера з імі, хай п'юць, хай гінуць — адным болей адным менш.

Захапілася, лічачы грошы, не заўважыла, як да ліку хворых стаў прымыкаць мужык, а потым — і сын.

Толькі тады — ад бяды падалей — закрыла вытворчасць, згарнула продаж, але было ўжо позна, бо яе «дурні-алкаголікі» ўсё роўна нешта знаходзілі ды пілі...

І цяпер яна ўжо гатова б хадзіць па ваколіцах, умольваць іншых, каб спыніліся, каб не гналі, каб не прадавалі, каб не губілі...

Але сорамна. Да таго ж яна, як, магчыма, ніхто, ведае і магутную сілу грошай, і поўнае бяссілле слоў.

## ПАД КАНТРОЛЕМ

Раніца, дождж, мой прыпынак і мой аўтобус, але на пад'ездзе яшчэ — пад святлафорам. Пакуль будзе стаяць — на чырвонае — можна купіць газеты.

Часу на гэта вобмаль, што кіяскёрка, відаць, разумее, бо разлічвае, што называецца, мігам. Мне застаецца (аўтобус ужо «падплыў») хіба «згрэбсці» пакупкі ды рэшту і кашалёк з ёй (часу ж няма) пакласці не ў сумку (ну колькі тут той язды...), а ў «дзяжурны» пакет.

Прыехаўшы, стала даставаць з яго змесціва і ці не першае, што ўбачыла — збоку, ля самага кашалька, роўненькую, акуратна прарэзаную (якраз для рукі!) дзірку.

Адкуль — гэта толькі здаецца, што жывём мы ў гармідары, сярод людзей, што чалавека тут ніхто і ніколі не бачыць.

Бачыць! Яшчэ і як! Асабліва — калі ён робіць нешта ўпохапкі і не так, як трэба.

Прынамсі, яму.

## СТРАШНЕЙ ЗА СМЕРЦЬ

Спачатку анекдот (пра самы страшны кашмар): зрабіць бутэрброды, заварыць гарбату, забурыцца ў ложак, сесці, абаткнуцца коўдрай і толькі тут заўважыць, што пульт ад тэлевізара застаўся ля пліты...

А гэта — праўда: пульт («чароўная «палачка») у руках, ліха мяняе каналы і на нейкім з іх ловіць эпізод: жанчына, вяскоўка, выпраўляе мужа у горад, у заробкі і, плачучы, прыгаворвае: «Загінеш ты там — сап'ешся ці ў турму пападзеш... Прападзеш!..»

Старое кіно: уперад прападалі так, цяпер у дадатак да гэтых, ёсць, як кажуць, і іншыя магчымасці — рабства, наркотыкі, страта памяці, забойства ці проста знікненне.

Што для блізкіх, здаецца, куды страшней... Нават за смерць.

## ПА СТАРЫХ АДРАСАХ

«Вайна» ад паўдня: хто каго пераможа — я праступу ці ўсё ж яна?

У яе — па ўсім — шанцаў болей, бо холад на працы проста сабачы, а да дома яшчэ ехаць і ехаць, а потым ісці...

Што добра — аптэка па дарозе. І чаргі як быццам няма: наперадзе жанчынка з мужчынам ды маладзён. Іх жа хутка абслужаць?..

Дзе там — першыя двое лекі бяруць ці не на ўсё жыццё: экранчык касы высвечвае іх кошт — 86 тысяч рублёў, 139, 216...

Нарэшце (на лічбе 387) — працэс спыняецца, маладзіца кажа (па-нямецку) свайму спадарожніку, што цяпер можна разлічыцца. Ён згодна «я-якае», з таўсценнага партманета дастае крэдытку...

Аднак мы, «чарга», трыумфавалі рана, бо пакупніца, пакуль аптэкарка «здымала» з той картачкі згаданую суму, успомніла нешта яшчэ, зноў жа па-нямецку (па-руску ён, здаецца, ні бум-бум) сказала спадарожніку (удвая старэйшаму, пузатаму), што вунь тыя лекі патрэбны яе сястры, але яна іх не купіць, бо гэта дарага, таму добра было б...

— Я-я, — зноў жа ахвотна заківаў немец.

І адлік на экранчыку пачаўся зноў...

Потым зноў завяршыўся — разлікам.

Але і на ім жанчына не спынілася...

— Мне анальгин. Без сдачи! — лопнула цярпенне ў наступнага па чарзе. — Зуб у жены разболелся...

— Нет уж! — абарвала яго маладзіца, — путь меня сначала абслужат!.

— Конечно, конечно, — паабяцала ёй аптэкарка і...

Усё пачалося спачатку.

Пасля чаго сужэнцы (?) гордыя і шчаслівыя (яна — бо купіла ўсё, што хацела, ён — бо змог заплаціць) такі падаліся да выхаду; маладзён — ну нарэшце — купіў анальгін, я — свае лекі ад прастуды.

Каб потым, прымаючы іх, між волі ўзгадваць аптэку і думаць, колькі нечалавечых пакут (мільёнам!) неслі калісь ачмурэлыя немцы!

Цяпер — «па старых адрасах» — іх нашчадкі прыносяць радасць.

Праўда, адзінкам.

## НЕ ТОЕ

Брук, паводле тлумачальнага слоўніка беларускай мовы, ёсць «укладзеная каменем праезная частка вуліцы, дарогі, плошчы» (як прыклад, Коласава: «Ідзе так дзядзька і па бруку Адзін за дзесяць робіць груку»).

У Празе кубікамі з каменю (сантыметраў 5 па «рабрыне») укладзены яшчэ і ходнікі. Прычым, здаецца, паўсюль! І вельмі даўно...

Што ўразіла — лічы, нідзе ніводзін з тых каменьчыкаў не адкалоўся, не выпаў, не «прасеў»!

У нас жа — нават у сталіцы (і ў цэнтры!) — калі не ямка на ямцы, дык латка на латцы (з ужо новых плітак), хоць «старыя» пакладзены зусім нядаўна. Чаму?

Не той матэрыял?

Не тыя рукі?

Не той грунт?

Усё — не тое.

## БАЦЬКІ

Ванда жыве адна: развялася (так выйшла)... Дзясяты год ужо... А дачушка — пяты як замужам! Дзякаваць Богу, дзіцятка ёсць... Харошае, ладнае... Праўда, кватэры няма, але гэта папраўнае, бо дом іх ужо будуецца, ды што там — пад страхою амаль...

Маці, каб памагчы дзіцяці сваіму, унучцы, зяцю, што называецца, рвецца з апошняга — працуе і падпрацоўвае, на ўсім эканоміць, лічыць кожную капеечку.

Бацька з новай жонкай летась (па звестках) з'ездзіў на адпачынак у Турцыю, сёлета — у Егіпет.

## ЯКІМ ТЫ БЫЎ...

Імя яго — Стасік, Стась — у вёсцы гучала нармальна, натуральна. У горадзе, куды хлапец пераехаў, мяккі знак здаваўся лішнім: ён стаў як бы замінаць, як бы прыніжаць... Прычым без падстаў! Бо ён жа, Стась, зажыў як усе: уладкаваўся на працу, засяліўся ў інтэрнат.

Спачатку ў яго там ложак быў, потым, калі ажаніўся, асобны пакой, калі з'явілася дачка — нават цэлы блок, а калі і сын (ну, «усё ж пуцём»!) — трохпакаёвая кватэра... Хай не адразу, хай наводшыбе...

Наперакос пайшло пазней, калі дачка ў няпоўныя 18 дадому (чытай: да бацькі) прывяла грамадзянскага мужа і сказала, што чакае двойню...

Пакуль выношвала яе, Стас паціху сівеў. Бо, па-першае, так званы зяць наадрэз адмаўляўся жаніцца, а па-другое, дзе сям'і гэтай жыць?

Дома, у вёсцы, ён бы нешта прыдумаў — «выбіў» бы новы асобны дом альбо купіў бы нейкую хату, зрабіў рамонт... У крайнім выпадку касцьмі лёг бы, а за 9 месяцаў «забамбіў» бы капітальную прыбудову да сваёй, а тут...

Тут нічога не прыбудуеш (смех нават думаць — дзявяты паверх); з іх даходамі і ў чаканні малых нічога не купіш; на прыватную кватэру дачку таксама не пашлеш, бо, па-першае, дзеці, двое — трэба памагчы, а па-другое, усё ўпіраецца ў грошы, якіх проста няма і не чакаецца...

І ў вёску не вернешся...

Жывуць усе разам. Так званы зяць дзяцей, дзякуй Богу, прызнаў, але ж не гадуе: прыйдзе, гадзіну-другую пасядзіць і цягу. Кажа, што яму пасля працы трэба адпачываць.

Што Стасу?!

...Зрэшты, цяпер ён гэтае імя не любіць, кажа, што Стасем быў, Стасем і застаўся.

## АД РОДНЫХ НІЎ...

Крамка ў двары маленькая і зранку пустая. А значыць, прадавачцы можна пакурыць (літаральна), памянціць языком. Што яна і робіць: ці не з кожным больш менш ахвотным заводзіць размовы. Ды хоць пра што! Што курэнне во гэтае — звычка шкодная і як для яе — дык дужа дарагая, але кінуць яна не можа — ужо спрабавала.

Яшчэ (да прыемнага чалавека прыемна хадзіць!) яна спрабавала паступаць... Працаваць на рынку... Жыць з мужам... Здымаць кватэру...

Цяпер вось — спрабуе штодзень ездзіць на працу (у Мінск з-пад Чэрвеня), бо ў яе там сынок, і гадуе яго бабуля — у садку ён дужа хварэў...

Не ведаю, чаму, але, вітаючы гэтую мілую, гаваркую жанчыну, мне заўсёды хочацца сказаць ёй не звычнае «Добры дзень» ці «вечар», а «Прывітанне чэрвеньскім!»...

Не кажу.

Бо тады — мяркуецца — гэтаксама трэба вітаць радашкоўскіх, глыбоцкіх, мядзельскіх...

І мінскіх у Мінску, лічы, не застанецца.

## БУМЕРАНГ

Дзень. Ходнік — прычым няправільны нейкі, бо вузкі і заблізка ад праезнай часткі. Добра, што кіроўцы на гэта зважаюць (прынамсі, у дождж): ёсць такая магчымасць — збочваюць у сярэдні рад, збаўляюць хуткасць.

У крайнім — аднаго толькі чэрці нясуць, падымаючы высокую хвалю бруднай вады і, адпаведна, апускаючы яе — на ходнік, на людзей...

Дзеўкі, што ідуць наперадзе, пад гэтым накатам рассыпаюцца і дзіка верашчаць, я — наадварот — нямею, спрабую ўгледзець нумар аўто, а кабета, што ідзе побач (у светлым паліто), кідае ўслед:

— Каб жа ты не даехаў, сабака!

...Не даязджаюць, як сведчаць СМІ і крыжы ды кветкі ля дарог, насамрэч многія.

Не факт, што ім (а тым больш усім) гэтага жадалі.

Але многім — маглі.

І тады бацькам іх трэба не толькі плакаць, а яшчэ і шкадаваць, што дзіця іх не засвоіла ці не самага галоўнага: усё, што ты робіш для іншых, ты робіш для сябе.

**Валянціна ДОЎНАР.**

# Беларускі саюз журналістаў абнавіў вэб-сайт

**КІРАЎНІКІ Беларускага саюза журналістаў правялі прэс-канферэнцыю, дзе прэзентавалі новы вэб-сайт свайго грамадскага аб'яднання:**



— Сайт быццам бы ў нас быў, але напаўняўся слаба, нерэгулярна, наведванняў у яго было няшмат, і жыццё падказала нам, што гэта трэба выпраўляць, — сказаў Анатоль Лемяшонак, старшыня ГА «БСЖ», галоўны рэдактар газеты «Рэспубліка». — А калі ўжо рабіць гэта, то рабіць магутна, сур'ёзна, прыкметна, таму мы недзе паўгода працавалі над ім.

На новым сайце БСЖ, акрамя непасрэдна інфармацыі пра само грамадскае аб'яднанне, будуць размяшчацца заканадаўчыя акты ў галіне журналістыкі, навіны, артыкулы, інфармацыя пра мерапрыемствы і прафесійныя конкурсы, а таксама раздзел вакансій для журналістаў. Як адзначылі прадстаўнікі БСЖ, пэўную цікавасць павінны выклікаць і блогі, якія будуць весці найбольш знакамітыя і вядомыя беларускія журналісты.

На жаль, новы сайт БСЖ зроблены толькі на рускай мове. Як патлумачыў Вадзім Гігін, адказны сакратар БСЖ, галоўны рэдактар часопіса «Беларуская думка», «сайт адлюстроўвае тую моўную сітуацыю, якая складваецца ў СМІ»:

— Мы не будзем займацца лакіраваннем рэчаіснасці, усё-такі значная частка СМІ выходзіць на рускай мове. Але мы будзем размяшчаць на сайце матэрыялы на мове арыгінала — калі гэта будзе матэрыял беларускамоўнага аўтара, то ён будзе размешчаны на беларускай мове.

Паглядзець новы сайт Беларускага саюза журналістаў можна па адрасе — ***http://buj.by/.***

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# Адказным трэба быць больш адказнымі

## ІНАКШ МОЖА ЎМЯШАЦЦА І ПРАКУРАТУРА

Пракуратура Оршы сёлета правяла праверку таго, як выконваецца адпаведнае заканадаўства аб зваротах грамадзян. Высветлілася, што, на жаль, адказным асобам трэба быць больш адказнымі і пільнымі пры разглядзе зваротаў.

У прыватнасці, у сакавіку мясцовая жыхарка інфармавала пракуратуру пра тое, што яна так і не атрымала пісьмовы адказ на зварот, які некалькі месяцаў таму накіравала ў вядомы ў Оршы будаўнічы трэст (№18). Тая заява жанчыны нават не была зарэгістраваная. А яна ж вельмі пакутавала з-за вільготнасці ў жылым доме. Яшчэ адзін жыхар горада яшчэ ў пачатку сакавіка звярнуўся да кіраўніцтва будаўнічай арганізацыі з просьбай адрамантаваць ці памяняць балконныя дзверы, якія былі ўстаноўлены з дэфектамі. Праз прыкладна пару тыдняў яму пісьмова паабяцалі, што дэфекты выправяць, і ўказалі канкрэтны тэрмін. За дзень да апошняга дня тэрміну грамадзяніну накіравалі адказ, дзе гаварылася, што яго патрабаванні задаволеныя. Але ж на момант правядзення праверкі пракуратура горада ўстанавіла, што будаўнікі нічога не зрабілі.

Як паведаміла «Звяздзе» **Вольга Вяржбовіч, пракурор арганізацыйна-кантрольнага аддзела пракуратуры Віцебскай вобласці,** пракуроры патрабавалі ад будаўнікоў выправіць недахопы і пісьмова паведаміць пра гэта грамадзянам. А кіраўнік трэста заплаціў штраф 140 тысяч рублёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


**МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**
**27 октября 2010 года повторно проводит открытый аукцион на право заключения договора аренды земельного участка в Минском районе**

| | | Лот 1 |
|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Минский район, Боровлянский с/с, д. Слободщина |
| 2 | Кадастровый номер | 623680608101000084 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1257 га |
| 4 | Срок аренды (лет) | 99 |
| 5 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 6 | Сумма убытков и потерь с/х производства (рублей) | — |
| 7 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 1 665 539 |
| 8 | Начальная цена права заключения договора аренды | 2 869 долларов США |
| 9 | Задаток (рублей) | 800 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 27.10.2010 г. в 9.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов 21.10.2010 г. Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток перечисляется на расчетный счет Боровлянского сельисполкома № 3600621010037 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал «АСБ Беларусбанк», ул. Карбышева, 13/2, г. Минск, УНП 600052345, код платежа 04901.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить потери сельскохозяйственного производства, вызванные изъятием сельскохозяйственных земель для использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства, и расходы, оговоренные в условиях проведения аукциона. Договор аренды земельного участка заключается с победителем в течение 2-х рабочих дней после внесения им всех причитающихся платежей.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками; ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем.

Документы, необходимые для участия в аукционе на право заключения договоров аренды земельных участков:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

Кроме того, в комиссию представляются:

• гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

• индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

• представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

• представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

• представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

• представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.



**Информация о проведении аукциона без условий по продаже имущества, обращенного в доход государства**

| | |
|---|---|
| Адрес объекта и его наименование | - одноэтажное кирпичное здание (комплекс состоит из столярного цеха, лесопильного цеха, бытового помещения, кран-балки), расположенное по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Элеваторная, 5, общей площадью 851,1 кв. м, год постройки – 1976.<br>Начальная цена – 207 846 000 рублей.<br>- бокс гаражный, кирпичный, расположенный по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Элеваторная, 5, общей площадью 92,8 кв. м, год постройки – 1978.<br>Начальная цена – 23 976 000 рублей. |
| Продавец | Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Молодечненском райисполкоме |
| Организатор аукциона | СИКУП «УКС-СЕРВИС» |
| Сумма задатка | 10 % от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-СЕРВИС» |
| Порядок оплаты | Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 2 месяцев и 25 дней на р/с СИКУП «УКС-СЕРВИС» |
| Документы, представляемые для участия в аукционе | Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, заверенные нотариально, доверенность, выданная представителю юридического лица; физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, справку ГНИ об отсутствии задолженности по подоходному налогу. |
| Конечный срок и адрес приема заявок | 02.11.2010 г. до 16.00, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис», тел. (8 0176) 75 16 09, (факс) 75 19 20, 8 044 710 74 60 |
| Дата, время и место аукциона | 03.11.2010 г. в 15.00, г. Молодечно, ул. Мира, 15, СИКУП «УКС-СЕРВИС» |



**МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**
**27 октября 2010 г. повторно проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе**

| | | Лот 1 |
|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Ждановичский с/с, д. Тарасово, ул. Ключевая |
| 2 | Кадастровый номер | 623681709601001885 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1604 га |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 1 668 893 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 140 000 000 |
| 7 | Задаток (рублей) | 13 000 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 27.10.2010 г. в 9.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов – 21.10.2010 г. Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лот 1 перечисляется на расчетный счет Ждановичского сельисполкома № 3600621030059 ГУ МФ РБ по Минской области (УНК 103), ф-л № 614 «АСБ Беларусбанк», код 520 УНП 600537220, назначение платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае, местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта).

3.1 Представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.



**МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**
**3 ноября 2010 г. повторно проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе**

| | | Лот 1 | Лот 2 | Лот 3 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Михановичский п/с, п. Михановичи | Михановичский п/с, п. Михановичи | Михановичский п/с, д. Котяги |
| 2 | Кадастровый номер | 623684204601001287 | 623684204601001307 | 623684204601000239 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1397 га | 0,1179 га | 0,1014 га |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 600 670 | 1 285 510 | 587 783 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 35 000 000 | 22 000 000 | 22 000 000 |
| 7 | Задаток (рублей) | 3 400 000 | 2 100 000 | 2 100 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 03.11.2010 г. в 9.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов – 28.10.2010 г. Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1–3 перечисляется на расчетный счет Михановичского сельисполкома № 3604621090138 в филиале 614 «АСБ Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНН 600303747, код платежа 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта).

3.1 Представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.



**ГАЙНЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ Логойского района (Продавец)**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже 5 (пяти) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:**

**Лот 1** — земельный участок № 1 в д. Красный Бор площадью 0,16 га, кадастровый номер 623280805601000031, начальная цена 2400000 белорусских рублей;
**Лот 2** — земельный участок № 2 в д. Красный Бор площадью участка 0,16 га, кадастровый номер 623280805601000030, начальная цена 2400000 белорусских рублей;
**Лот 3** — земельный участок № 3 в д. Красный Бор площадью участка 0,1716 га, кадастровый номер 623280805601000029, начальная цена 2574000 белорусских рублей;
**Лот 4** — земельный участок № 4 в д. Красный Бор площадью участка 0,2111 га, кадастровый номер 623280805601000028, начальная цена 3166500 белорусских рублей;
**Лот 5** — земельный участок № 1 в д. Прудки площадью 0,25 га, кадастровый номер 623280809101000032, начальная цена 3750000 белорусских рублей;

Целевое назначение земельных участков — строительство и обслуживание жилого дома.

Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/счет № 3600619021104 в ЦБУ 611 ф-ла 500 Минское управление АСБ «Беларусбанк», МФО 153001601, УНП 600181697. Аукцион состоится **16.11.2010 г. в 11.00** по адресу: Логойский район, д. Гайна, ул. Советская, 14. Заявление на участие и необходимые документы принимаются **до 13.11.2010 г. до 13.00** по адресу: Логойский район, агр. Гайна, ул. Советская, д. 14.

**Контактные телефоны: (8 01774) 58 2 35, 58 2 36, 56 4 98.**


# СЯМ'Ю НА ПАЖАРЫ ВЫРАТАВАЛА ДАЧКА

Здарэнні

Пашчасціла насельнікам кватэры на дзясятым паверсе дзесяціпавярховага дома па вуліцы Гінтаўта ў сталіцы: а палове другой гадзіны ночы дачка гаспадыні жылля адчула пах дыму і патэлефанавала ў цэнтр аператыўнага кіравання пры Мінскім гарадскім упраўленні МНС.

Першыя падраздзяленні былі на месцы здарэння літаральна праз пяць хвілін. З кватэры, якая гарэла, яны выратавалі пяць чалавек: гаспадыню і яе мужа, дачку і дваіх дзетак (дзяўчынку 2003 года нараджэння і хлопчыка 2009 года нараджэння). Сужэнцы шпіталізаваныя з траўмамі рознай ступені цяжкасці. Як мяркуецца, прычынай пажару стала неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні нецвярозай гаспадыні кватэры. У выніку здарэння агнём пашкоджаныя прадметы мэблі, бытавая тэхніка, шкленне кватэры.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Твае правы

# «Трымаць» вакансію можна два тыдні

Сяргей ГРЫБ

**Жаданне знайсці добрую працу, напэўна, зразумелае ці не кожнаму з нас. Аднак праблема часцякам узнікае з іншым: уладкавацца на пажаданую вакансію бывае няпроста — заўсёды існуе верагоднасць, што прэтэндэнт на свабоднае месца проста пачуе адмову. Між тым, ці можна тут неяк паспрачацца з рашэннем наймальніка і якім чынам гэта зрабіць? Каб адказаць на гэтыя пытанні, карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з начальнікам юрыдычнага аддзела камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Элай Міхайлаўнай АКУЛАЙ.**

## ДЛЯ БЕСПРАЦОЎНЫХ. І НЕ ТОЛЬКІ

Безумоўна, пашукаць свабоднае месца можна самастойна або праз сваіх сваякоў ці знаёмых. Аднак гэты варыянт спрацоўвае далёка не заўсёды. Таму калі-нікалі застаецца адно — звяртацца па дапамогу ў дзяржаўную службу занятасці насельніцтва.

Дарэчы, звярнуць увагу на службу занятасці варта не толькі непасрэдна беспрацоўным, але і ўсім тым, хто проста хоча змяніць месца працы. У прыватнасці, у службе (прычым зусім бясплатна) можна пазнаёміцца з банкам вакансій. Нарэшце, той жа банк вакансій у сталіцы размяшчаецца і ў інтэрнэце — на сайце minsk.gov.by/rabota.

## НАКІРАВАННЕ «НЕ ЗАЎВАЖЫЦЬ» НЕЛЬГА

Інфармацыя — рэч вельмі важная. Аднак проста ведаць пра свабодныя працоўныя месцы недастаткова. Вакансію трэба заняць. І гэта — самы цікавы момант. З аднаго боку, кожны прэтэндэнт павінен падаць абсалютна аднолькавы пакет дакументаў: дакумент, які сведчыць пра асобу, дыплом аб адукацыі і прафесійнай падрыхтоўцы, страхавое пасведчанне, пры наяўнасці — дакументы воінскага ўліку, працоўную кніжку, а пры неабходнасці — медыцынскае заключэнне аб стане здароўя, індывідуальную праграму рэабілітацыі інваліда, накіраванне на работу за кошт броні, дэкларацыю аб даходах і маёмасці і г.д. Аднак зразумела: наймальнік будзе рабіць выбар. І цалкам рэальна, што хтосьці з прэтэндэнтаў атрымае адмову.

Калі прэтэндэнт належыць да катэгорыі дзяцей-сірот, бацькоў у шматдзетнай сям'і, інвалідаў, асобаў ва ўзросце да 21 года, якія шукаюць першае працоўнае месца, былых зняволеных і бацькоў, якія абавязаныя кампенсаваць выдаткі на дзяржаўнае ўтрыманне сваіх дзяцей, і пры гэтым такі прэтэндэнт мае накіраванне службы занятасці на працаўладкаванне за кошт спецыяльнай броні, то за неабгрунтаваную адмову ад прыёму на працу наймальніка можа чакаць пакаранне. Паводле артыкула 9.16 Адміністрацыйнага кодэкса на вінаватую службовую асобу наймальніка магчыма накладанне штрафу у памеры ад 20 да 50 базавых велічынь (на сёння ад 700 тыс. да 1 млн 750 тыс. рублёў).

## ПІСЬМОВА — ЗАЯВУ, ПІСЬМОВА — АДКАЗ

Каб усё ж атрымаць пажаданую вакансію, прадстаўнікі пералічаных катэгорый могуць звярнуцца ў суд. І такую ж магчымасць мае любы іншы прэтэндэнт — калі ён лічыць, што наймальнік паставіўся да яго прадузята.

— Падбіраць для сябе тых або іншых работнікаў — поўнае права наймальніка, — адзначае Эла Акула. — Галоўнае, каб наймальнік прыняў рашэнне, зыходзячы выключна з кваліфікацыі і прафесійных якасцяў, а не з якіх-небудзь іншых асаблівасцяў прэтэндэнта. Калі на першае месца выходзіць нацыянальнасць, узрост, пол ці нават знешнасць саіскальніка — выпадае весці гаворку пра дыскрымінацыю. І тады з'яўляюцца падставы для звароту ў суд.

Суду неабходна прадаставіць дакументы і, у прыватнасці, тлумачэнне наймальніка — што ўсё ж стала прычынай рашэння не прымаць на працу. Атрымаць такое тлумачэнне бывае складана. Тым не менш шанцы тут ёсць. Кожны можа падаць пісьмовую заяву з просьбай аб прыёме. І, паводле заканадаўства аб зваротах грамадзян, наймальнік будзе вымушаны адказаць на гэтую заяву таксама пісьмова.

Варта адразу ж заўважыць: верагоднасць таго, што прычына адмовы будзе прызнана менавіта дыскрымінацыйнай, невялікая. Але яна ўсё ж існуе. Прычым калі суд возьме бок прэтэндэнта на вакансію, яго будуць абавязаныя прыняць на працу.

## «ПРАПІСКА» — ДАДАТКОВЫ АРГУМЕНТ

Рынак працы сталіцы лічыцца традыцыйна прывабным: у буйнейшым горадзе краіны колькасць вакансій нашмат перавышае колькасць беспрацоўных, прычым тут прапанова заробкаў часцяком аказваецца вышэй за сярэднерэспубліканскі ўзровень. Варыянты ўладкавання ў Мінску заўсёды цікавілі жыхароў іншых рэгіёнаў. Прычым цяпер атрымліваць якія-небудзь дадатковыя дазволы іншагароднім ужо не трэба. А адмова ў прадстаўленні свабоднага месца толькі з-за адсутнасці «патрэбнай прапіскі» можа таксама стаць падставай для звароту ў суд.

— Адмова ў прыёме на працу толькі з-за адсутнасці рэгістрацыі ў Мінску з'яўляецца незаконнай, — падкрэслівае Эла Акула. — Разам з тым у гэтай сітуацыі ў нечым можна зразумець і наймальніка: напрыклад, калі ён даручае матэрыяльныя каштоўнасці, то пажаданне, каб работнік жыў блізка ад месца працы і каб у выпадку чаго яго можна лёгка было знайсці, з'яўляецца натуральным. Прэтэндэнт на вакансію павінен гэта ўсведамляць. Тым больш што сёння няма аніякіх праблем зарэгістравацца ў Мінску па месцы знаходжання — без страты пастаяннай рэгістрацыі ў іншым населеным пункце.

## ЗА МАЎЧАННЕ ГРОШЫ ПЛАЦЯЦЬ

Нарэшце, яшчэ адна сітуацыя. Чалавек шукае працу і даведваецца, што ў пэўнай арганізацыі з'явілася даволі цікавая вакансія. Пасля ён звяртаецца ў аддзел кадраў. Аднак там кажуць, што інфармацыя пра свабоднае месца — памылковая.

— На жаль, спробы «ўтойвання» свабодных працоўных месцаў сапраўды здараюцца, — адзначае Эла Акула. — Таму нялішне нагадаць заканадаўства: калі ўтвараецца вакансія, то наймальнік абавязаны паведаміць пра гэта ў дзяржаўную службу занятасці насельніцтва на працягу двух тыдняў — нават калі гаворка ідзе пра палову або чвэрць стаўкі. У адваротным выпадку могуць быць выкарыстаныя санкцыі паводле артыкула 9.15 Адміністрацыйнага кодэкса: штраф у памеры да 100 базавых велічынь на юрыдычную асобу і штраф ад 20 да 50 базавых велічынь на канкрэтную вінаватую службовую асобу наймальніка.

Жылплошча

# «Прыбіральшчыца павінна мыць пад'езд раз на тыдзень»

**У адным савецкім мультфільме была фраза «Чысціня — залог здароўя! Парадак перш за ўсё!»**
**«Ці ёсць нейкія нарматывы, якія рэгламентуюць вываз смецця ў вёсцы? А то мы выстаўляем мяхі для машыны ў 8.00, калі на працу ідзем, а забіраюць іх у 15.00. Пакуль машына прыедзе, смецце расцярушваецца. У гарадах ёсць дворнікі, а ў нас ніхто не прыбірае, і ўся вёска ў брудзе», — расказвае спадарыня Алена з Мінскай вобласці.**

— Спецыяльных дакументаў на ўзроўні закона няма, — адказалі ва ўпраўленні ЖКГ Мінскай вобласці. — Самі раённыя прадпрыемствы вызначаюць графік вывазу смецця. Раней гэтым займаліся сельвыканкамы, а летась за гэта стала адказваць ЖКГ. І камунальнікі проста не спраўляюцца. Тэхнікі не хапае. Прыбіраннем вясковых тэрыторый ЖКГ займаецца, але там ёсць спецыяльныя санітарныя схемы. Таму варта паспрабаваць нейкім чынам дамовіцца са сваім ЖЭУ, каб яны, магчыма, змянілі час.

*Для таго, каб гэта зрабіць у некаторых ЖЭУ, жыхары запасаюцца стальной сілай волі і невычарпальным цярпеннем.*

***— Я жыву ў кватэры чатыры месяцы. І ў нас ніколі не прыбіралі пад'езд. Колькі разоў яго павінны мыць згодна з тэхнічнымі нарматывамі?***

**Дар'я,** *Мінск.*

Па словах Эдмунда Грышкевіча, начальніка ўпраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства ЖКГ, вільготнае падмятанне лесвіцы павінна ажыццяўляцца раз у дзень. Мыццё і дэзінфекцыя лесвічнай пляцоўкі — раз на тыдзень, а мыццё вокнаў — два разы на год.

*...З уласных тэхнічных нарматываў некаторых прыбіральшчыц: пасыл «куды далей» — раз на дзень, фраза «панасмецілі, ногі ім бы паадрываць» — штовечар, нявыхад на працу — два разы на тыдзень.*

***— У нашым інтэрнаце цячэ ледзь цёплая вада. Немагчыма мыцца. Скажыце, якая тэмпература ў яе павінна быць?***

**Наста**, *Магілёў.*

— Тэмпература гарачай вады не павінна быць ніжэйшай за 50 градусаў Цэльсія, — сведчыць тэкст сацыяльных стандартаў. Гэта, згодна з дакументам, дазваляе забяспечыць неабходныя санітарна-гігіенічныя патрабаванні.

*...У вёсцы Спорава Бярозаўскага раёна кажуць, што спораўцы звычайна мыюцца ў возеры. «А зімой?» — здзіўляюцца прыезджыя. «А колькі той зімы», — хітра ўсміхаюцца яны.*

**— У нас першы дом ад цеплатрасы, і нам пастаянна горача. Мы тэлефанавалі ў ЖЭУ, а там сказалі, што тэмпературу знізіць не могуць, таму што тады жыхары апошніх дамоў будуць скардзіцца. Што рабіць?**

**Кацярына Міхайлаўна,** *г. Баранавічы.*

— Вам варта звярнуцца ў раённы аддзел кацельнай гаспадаркі, — расказалі спецыялісты дыспетчарскай службы Брэсцкага ўпраўлення ЖКГ. — Яны разбяруцца і паглядзяць усе схемы цеплападачы. Магчыма, дзесьці соплы падачы зменшаць. У тых дамах, дзе холадна, соплы звычайна рассвярліваюць. Гэта ўсё рэгулюецца цяпер. Адназначна, што варыянты знаходзяцца.

*...А далей ужо можа «пашчасціць», што гэтыя варыянты не выльюцца ў лічбу са шматлікімі нулямі.*

**Настасся ЗАНЬКО.**

# ПРАДПРЫМАЛЬНІЦКАЯ АКТЫЎНАСЦЬ СТАНЕ КАТАЛІЗАТАРАМ РАЗВІЦЦЯ ЭКАНОМІКІ, А ДАХОДЫ НАСЕЛЬНІЦТВА Ў 2015 ГОДЗЕ ПАВІННЫ ВЫРАСЦІ Ў 1,7-1,8 РАЗА

У 2015 годзе рэальныя даходы насельніцтва Беларусі павінны вырасці ў 1,7-1,8 раза ў параўнанні з узроўнем 2010 года, пра гэта заявіў **дырэктар Навукова-даследчага эканамічнага інстытута Мінэканомікі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ** падчас XI міжнароднай навуковай канферэнцыі «Праблемы прагназавання і дзяржаўнага рэгулявання сацыяльна-эканамічнага развіцця», якая прайшла на базе інстытута. У прыватнасці, такое павышэнне даходаў насельніцтва будзе пры забеспячэнні да 2015 года росту ВУП на 62-68% у параўнанні з 2010 годам, росту прадукцыйнасці працы на 63-68%, удзельнай вагі адгружанай інавацыйнай прадукцыі ў 21% ад агульнага аб'ёму адгружанай прамысловай прадукцыі.

— Распрацоўка праграмы антыкрызісных мераў дазволіла Беларусі нават у пік крызісу застацца адной з тым нешматлікіх краін, дзе ВУП працягваў расці, — сказаў Аляксандр Чарвякоў. — Сёння эканоміка краіны развіваецца і стаіць ужо пытанне не пра выхад з крызісу, а пра далейшы паспяховы посткрызісны рух.

Як сказаў дырэктар НДЭІ Міністэрства эканомікі, вынікі 2010 года ў Беларусі будуць набліжаны да вынікаў тых сектараў свету, якія сёння найбольш дынамічна развіваюцца — у прыватнасці, да вынікаў новых індустрыяльных краін Азіі. Таксама добрую тэндэнцыю Аляксандр Віктаравіч бачыць у росце індэкса прамысловага аптымізму, які выводзіцца НДЭІ падчас штомесячнага кан'юнктурнага апытання — «гэты фактар сведчыць пра станоўчыя змены ў настроях прадпрымальнікаў».

— У шэрагах лідараў можа быць толькі тая краіна, якая накіраваная на бесперапыннае абнаўленне, эвалюцыйныя пераўтварэнні эканамічнага жыцця, дэмакратычных інстытутаў, на кардынальныя змены ў тэхналагічнай, эканамічнай і культурнай галінах, на няўхільнае павышэнне якасці жыцця, — сказаў Аляксандр Чарвякоў і дадаў, што гэтыя пераўтварэнні будуць накіраваныя на далейшую пабудову ўстойлівай, адкрытай і канкурэнтаздольнай эканомікі, фарміраванне прафесійнай і эфектыўнай сістэмы дзяржкіравання, і самае галоўнае — на павышэнне дабрабыту беларускага народа. — У сярэднетэрміновай перспектыве мы павінны рэалізаваць галоўную ідэю нашай сацыяльнай стратэгіі: забяспечыць беларускі нацыянальны стандарт якасці — жыццё на сярэднееўрапейскім узроўні з далейшым набліжэннем да лепшых еўрапейскіх паказчыкаў.

Як патлумачыў дырэктар НДЭІ, гэта будзе ажыццяўляцца за кошт канцэнтрацыі рэсурсаў у шэрагу прыярытэтных напрамкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2011-2015 гады. Аднак, на яго думку, рэалізацыя такіх стратэгічных планаў немагчымая без паўнавартасных пераменаў у грамадстве:

— Мы лічым, што асноўнымі рухальнымі сіламі развіцця эканомікі ў наступнай пяцігодцы павінны стаць ініцыятыва і прадпрымальніцтва, інавацыі і інвестыцыі, — сказаў Аляксандр Чарвякоў. — Асноўным каталізатарам развіцця эканомікі павінны выступіць разняволенне прадпрымальніцкай актыўнасці і ініцыятывы, а наша задача — стварыць усе ўмовы для таго, каб бізнэс — як дзяржаўны, так і прыватны, як айчынны, так і замежны — камфортна адчуваў сябе ў Беларусі. Мы будзем імкнуцца да збалансаванасці, паўнавартаснага ўзаемадзеяння і кансалідацыі дзяржаўнай і прыватнай формаў уласнасці, у тым ліку і праз механізмы прыватна-дзяржаўнага партнёрства. Гэта прадугледжвае мадэрнізацыю эканамічных інстытутаў і механізмаў дзяржаўнага рэгулявання, сутнасць якой заключаецца ў паступовым паніжэнні ролі дзяржорганаў у прамым гаспадарчым кіраванні ды змяшчэнні акцэнтаў на ўскосныя і індыкатыўныя інструменты дзяржрэгулявання, у пераходзе да стратэгічнага планавання, фарміравання галіновых інавацыйных стратэгій і навукова-тэхнічнай палітыкі, — падкрэсліў Аляксандр Чарвякоў.

Асобна дырэктар Навукова-даследчага эканамічнага інстытута адзначыў важнасць інавацый і інвестыцый, пры чым падкрэсліў, што трэба не толькі выкарыстоўваць перадавыя сусветныя тэхналогіі, але і адраджаць айчынную навуковую школу.

Дарэчы, сёлета Навукова-даследчы эканамічны інстытут адзначае сваё 80-годдзе, і яго кіраўнік перакананы, што калектыў гатовы садзейнічаць развіццю эканомікі Беларусі і хутчэйшаму ажыццяўленню эканамічных пераўтварэнняў:

— Сёння на рынку перамагае той, хто максімальна ўзброены сучасным інструментарыем і своечасова прымае рашэнні, хто можа найбольш хутка адаптавацца да зменлівага асяроддзя. І менавіта ў гэтым аспекце нам бачыцца вядучая роля нашага інстытута, і мы спадзяёмся, што намаганні нашых спецыялістаў створаць умовы для правядзення ў краіне эканамічных рэформаў, — сказаў Аляксандр Чарвякоў.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

Факт

## ПРЫЙШЛА ДА БАБУЛІ ЎНУЧКА...

якая нядаўна выйшла з месцаў пазбаўлення волі. Пра што яны вялі гутарку бліжэй да вечара, невядома. Аказваецца, яшчэ днём дачка старэйшай з жанчын (маці для маладзейшай) заходзіла і тушыла падпаленую канапу. Але ж вынікаў ніхто не зрабіў, бо, як расказалі ў прэс-службе Гомельскага абласнога МНС, грамадзянкі любілі і выпіць, і папаліць. Не дзіўна, што, калі ноччу ў кватэру выклікалі выратавальнікаў, яны выцягнулі з пакоя 21-гадовую дзяўчыну (яна была без прытомнасці), якую перадалі медыкам. А вось 69-гадовую бабулю выратоўваць было позна...

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## САРОЧЫНСКІЯ БОЕПРЫПАСЫ

Ля вёскі Сарочына Ушацкага раёна ў лесе днём пры вытворчасці земляных работ знайшлі восем вучэбных артылерыйскіх снарадаў калібру 125 міліметры і адзінаццаць вучэбных снарадаў калібру 122 міліметры. Ваенныя, якіх выклікалі на месца знаходкі, вывезлі снарады ў бяспечнае месца і знішчылі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ**

Покупатель – Кличевская Виктория Евгеньевна, 212017, г. Могилев, ул. Народного Ополчения, д. 22, кв. 19, т. 8 0291 15 38 15.

Эмитент – Открытое акционерное общество «Монтажлегмаш», 212030, г. Могилев, Славгородское шоссе, 173.

Количество акций – 25.

Цена приобретения – от 80000 рублей до 150000 рублей.

Сроки, форма и порядок оплаты акций – с 17.10.2010 г. по 17.11.2010 г., путем безналичного перечисления денежных средств.

Адрес, по которому будут совершаться сделки, – ОАО «БВФБ».

Дата начала и окончания срока представления предложений акционеров на продажу акций – с 17.10.2010 г. по 17.11.2010 г.

Дата начала и окончания покупки акций – с 17.10.2010 г. по 17.11.2010 г.

**НАПЭЎНА, ужо ўсе чулі, што сёлета абяцаюць вельмі халодную зіму. Я ў гэтыя прагнозы веру, таму што мая котка есць, як кажуць, «як не ў сябе». Яна жыве ў нас ужо 10 гадоў, але ніколі не была такой тоўсценькай. Не ведаю, як вам, паважаныя нашы чытачы, а мне, калі холадна, — хочацца мяса! Таму сёння будзем гатаваць толькі мясныя стравы, але з незвычайнымі спалучэннямі прадуктаў.**




альбо На пампушкі да Алены

### ГНЁЗДЫ З ФАРШУ І ПАМІДОРАЎ

**Вазьміце:** *500 г мяснога фаршу, 1 цыбуліну, 1 яйка, 1 чэрствую булачку, 200 г сыру, 2 свежыя памідоры, соль і перац на смак, спецыі: базілік, маяран, папрыку, 50 г алею, свежае зяленіва.*

Булачку заліць цёплай вадой, даць размокнуць, затым адціснуць. Ачысціць і дробна парэзаць цыбуліну. Вымесіць у місцы мясны фарш, яйка, булачку і цыбулю. Запраўіць спецыямі: базілікам, маяранам і папрыкай. Надзерці на буйной тарцы сыр і палову змяшаць з фаршам. Усё пасаліць і паперчыць. Падзяліць фарш на 8 ляпёшак, выкласці іх на змазаную алеем бляху. У цэнтры кожнай ляпёшкі зрабіць невялікае паглыбленне і ў яго пакласці дробна парэзаныя памідоры. Паставіць на 10 хвілін у добра разагрэтую духоўку. Затым дастаць, пасыпаць зверху астатнім сырам. 1 памідор разрэзаць на долькі і накрыць кожнае «гняздо» з фаршу такой долькай. Паставіць у духоўку яшчэ на 10 хвілін.

### МЯСА З АПЕЛЬСІНАМІ

**Нам спатрэбіцца:** *500—600 г мяса (свініны), 1,5 шклянкі апельсінавага соку (лепш свежавыціснутага), 1 чайная лыжка гарчыцы, 1 чайная лыжка мёду, 1 зубок часнаку, соль, перац, 2 апельсіны.*

Мяса нарэзаць на скрылікі таўшчынёй каля 2 см, злёгку адбіць, пасаліць і абсмажыць з абодвух бакоў да з'яўлення румянай скарыначкі. Часнок парэзаць тонкімі пласцінкамі, дадаць да мяса і смажыць яшчэ 5 хвілін, паменшыўшы агонь і пастаянна памешваючы. Уліць у патэльню з мясам свежы апельсінавы сок, дадаць гарчыцу, мёд, добра перамяшаць. Зменшыць агонь і тушыць пад накрыўкай 30—40 хвілін. Соус павінен уварыцца прыкладна напалову. Апельсіны ачысціць цалкам, каб засталася адна мякаць. Пасля таго, як соус уварыцца, выкласці ў патэльню ачышчаныя апельсіны. Патушыць яшчэ 15 хвілін на маленькім агні, увесь час памешваючы. Гатовае мяса выкласці на талерку, паліць соусам і ўпрыгожыць свежымі і смажанымі апельсінамі.

### ЯЛАВІЧЫНА, ТУШАНАЯ З КАВАЙ

**Вазьміце**: *500 г мяса, 2 цыбуліны, 2—3 сталовыя лыжкі алею, 1/2 шклянкі чорнай кавы, 2 памідоры, 100 г вяршкоў або смятаны, соль, перац, зяленіва пры жаданні.*

Ялавічыну парэзаць кубікамі (1,5 см), абсмажыць у алеі на вялікім агні, калі пачне румяніцца, зменшыць агонь да сярэдняга і дадаць рэпчатую цыбулю, працягваць смажыць да мяккасці цыбулі. Дадаць 1—2 шклянкі вады, каб мяса цалкам пакрылася вадкасцю. Туды ж парэзаць ачышчаныя памідоры. Давесці да кіпення і зменшыць агонь да мінімуму, тушыць да поўнай гатоўнасці 1—2 гадзіны (залежыць ад таго, якое вы ўзялі мяса). Пасаліць, паперчыць, можна скарыстацца запраўкай для гуляшу. Зварыць у турцы каву, працадзіць і ўліць у мяса. Да смятаны дадаць сталовую лыжку мукі, добра размяшаць, развесці вадой і атрыманую масу выліць у мясны соус (уліваць трэба, пастаянна памешваючы соус), даць пракіпець. Можна запраўіць зяленівам. На гарнір добра падыходзіць бульбачка або макароны.

### СВІНІНА З НЕКТАРЫНАМ

**Вазьміце**: *500 г свініны (шыйку або лапатку з тлушчам), 1—2 нектарыны, перац, соль, спецыі на смак, алей.*

Мяса парэзаць кавалачкамі-палоскамі, пасаліць, паперчыць і падсмажыць на алеі. Калі мяса будзе гатовае — дадаць парэзаны нектарын і смажыць яшчэ 2 хвілінкі. Усё пасыпаць зялёнай цыбуляй.

### ЦЯЛЯЦІНА, ЗАПЕЧАНАЯ З ВІШНЯЙ

**Нам спатрэбіцца**: *кавалак цяляціны на 600—800 г, вішня без костачак 400—500 г (у мяне быў 450-грамовы пакет замарожаны), 1 сталовая лыжка мукі, 100 г сметанковага масла, соль, спецыі на смак.*

Цяляціну без касцей абмыць, абсушыць, пасаліць, паперчыць на смак. На мясе зрабіць шмат надрэзаў у адвольным парадку і нашпігаваць вішнямі (замарожаныя вішанькі вельмі добра ўмяшчаліся ў разрэзы), пакінуць паўшклянкі вішні для соусу. Пакласці мяса ў глыбокі посуд, дадаць масла і запякаць да паўгатоўнасці пры тэмпературы 190—200° каля 50 хвілін, перыядычна паліваючы сокам, які ўтварыўся. Астатнюю вішню здрабніць у блендары, атрыманую масу развесці вадой да 1 шклянкі. Муку злёгку абсмажыць на сухой патэльні, развесці вішнёвым сокам, паліць атрыманым соусам мяса і тушыць далей да гатоўнасці каля 40 хвілін, таксама перыядычна паліваючы сокам. Мяса нарэзаць скрылікамі шырынёй каля 1 см і паліць соусам ад тушэння.

Страва не вельмі складаная, а такая ўжо смачная атрымліваецца! І соус — проста цуд!

**Ядомы анекдот**

***Дзякуй, усё было вельмі смачна. Асабліва ўдаліся Вам рыбныя кансервы.***

## БАЛОН ВЫЦЯГНУЛІ

Балон з прапанам ляжаў у аўтамабілі ГАЗ-66, які прывёз рабочых у вёску Хутар Светлагорскага раёна. Людзей 26-гадовы кіроўца высадзіў, пасля чаго заўважыў, што кузаў машыны, дзе знаходзіцца газ, гарыць. Выратавальнікі, якія прыехалі і пачалі заліваць полымя вадой, выцягнулі небяспечны балон з машыны. А вось аўтамабілю зусім не пашанцавала. Прычынай пажару магла стаць пакінутая без нагляду ацяпляльная печ, якая знаходзілася ў кузаве. **Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

**ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА**

**ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО ОАО «ТРЕСТ БЕЛСТРОМРЕМОНТ»**

**Лот № 1. Комплекс имущества, состоящий из:**
- здания специализированного для производства строительных материалов (растворного узла), инв. № 200/С-60411, общ. пл. 189,2 кв. м, 1992 г. постройки;
- здания административно-хозяйственного, инв. № 200/С-60413, общ. пл. 378,2 кв.м;
- здания специализированного трансформаторной подстанции, инв. № 200/С-60412, общ. пл. 26,8 кв. м;
- производственного здания, инв. № 200/С-60415, общ. пл. 1092,7 кв. м;
- производственного изолированного помещения № 1, инв. № 200Д-109892, общ. пл. 458,3 кв. м;
- производственного изолированного помещения № 3 (помещения транспортного назначения), общ. пл. 323,2 кв. м, инв. № 200/Д-109894;
- производственного изолированного помещения № 2 (складского помещения), общ. пл. 201,2 кв. м, инв. № 200/Д-109893;
- путей подкрановых (под козловой кран) длиной 46 м;
- ограждения железобетонного высотой 2,2 м, длина 350 м;
- ворот металлических, шириной 2,1 х 4,5 м — 3 шт.;
- крана козлового г/п 3,5 — 1 шт.;
- асфальтового покрытия пл. 2771 м кв.;
- бетонной площадки пл. 3868 м кв.;
- хозяйственно-бытовой канализационной сети (150 мм, керамика) длиной 100 м;
- сети водопроводной (100 мм, сталь) длиной 10 м;
- сетей электроснабжения АВВГ 50 х 4 — 200 м;
- емкости для цемента 52 — 1 шт.;
- емкости для цемента 56,3 — 1 шт.;
- силового трансформатора ТМГ 250/10 — 1 шт.;
- камеры КСО 366 — 4 шт.;
- щитового оборудования ЩО-70 — 3 шт.;
- конденсаторной установки УКЛН-038-150 — 1 шт.;
- щита освещения ОЩВ-6 — 1 шт.

Стоимостью 1 213 401 600 (Один миллиард двести тринадцать миллионов четыреста одна тысяча шестьсот) белорусских рублей, расположенный по адресу: г. Витебск, ул. Полярная, 2.

Стоимость имущества указана с учетом НДС.

Минимальная величина первого шага составляет 5 % от стоимости реализуемого с торгов имущества.

**Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://Minsk.court.by/,**
а также в помещении хозяйственного суда г. Минска: г. Минск, ул. Академическая, 15/1.

**Торги состоятся 28.10.2010 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201.**

**За дополнительной информацией обращаться: судебный исполнитель Минец И.Н., тел.-факс: 294 93 66; ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел. 294 93 67.**

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код 795, УНП 101541763 хозяйственного суда города Минска не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Дата, время и место проведения аукциона, организатор торгов | Аукцион состоится 24 ноября 2010 г. в 11.00 по адресу: г. Жлобин, ул. Петровского, 45 КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью» | | | |
| 2 | Срок приема документов | с 9.00 до 17.00 по рабочим дням по 18 ноября 2010 года | | | |
| 3 | Номер лота | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 4 | Адрес земельного участка | Жлобинский район, г. Жлобин, проезд Красный, 7 | Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Промышленная, 19-в | Жлобинский район, г. Жлобин, пер. Заводской 1-й, 12/1 | Жлобинский район, Пиревичский с/с, д. Салтановка, ул. Вокзальная (в районе ж/д вокзала) |
| 5 | Кадастровый номер участка | 321850100004002470 | 321850100003003401 | 321850100001001525 | 321884805101000119 |
| 6 | Площадь, га | 0,0400 | 0,0500 | 0,1463 | 0,1091 |
| 7 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания автосалона | Для строительства автомойки, автомагазина, шиномонтажа и других объектов, связанных с автосервисом | Для строительства стоянки для разбора автомобилей с магазином | Для строительства объекта торговли |
| 8 | Срок аренды | 30 (тридцать) лет | 30 (тридцать ) лет | 15 (пятнадцать) лет | 10 (десять) лет |
| 9 | Характеристика территории и расположенных на участке инженерных коммуникаций; строений и сооружений; инженерно-геологические условия | Участок свободен от застройки (инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ) | | | |
| 10 | Ограничения и условия | 1. Внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка.<br>2. Возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона (лот № 2) и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания и изменения земельного участка (лоты №№ 1, 3, 4).<br>3. Заключение победителем с райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок.<br>4. Получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 1 год (лоты №№ 1, 2, 3, 4).<br>5. Осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией. | | | |
| | | 6. 0,0167 га – охранная зона линии электропередачи с напряжением 10 кВт | – | 0,0885 га – охранная зона линии электропередачи с напряжением 10 кВт | 0,0299 га – охранная зона линии электропередачи с напряжением 10 кВт |
| 11 | Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории | Подключение к общегородским сетям и сооружениям инженерной инфраструктуры выполняется по техническим условиям эксплуатирующих организаций с учетом нагрузок, определенных при разработке ПСД. | | | |
| 12 | Начальная стоимость, рублей | 3 948 548 | 5 530 367 | 16 307 438 | 65 569 |
| 13 | Сумма задатка, рублей | 300 000 | 500 000 | 1 000 000 | 6 000 |
| 14 | Затраты по изготовлению землеустроительной документации, рублей | 618 062 | – | 1 486 127 | 1 518 058 |
| 15 | Стоимость расходов по организации и проведению аукциона (ориентировочно), рублей | 1 000 000 | 1 000 000 | 1 000 000 | 1 000 000 |

1. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь 26.03.2008 № 462.

2. Аукцион состоится при наличии не менее двух участников. Не допускается продажа по начальной цене. Победителем признается участник, предложивший наиболее высокую цену. В течение 10 рабочих дней местный исполнительный комитет принимает решение о предоставлении земельного участка в аренду. Победитель обязан внести плату за право аренды земельного участка, определенную в результате торгов, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона.

3. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление об участии в нем подано только одним гражданином, индивидуальным предпринимателем или юридическим лицом, местный исполнительный комитет при наличии согласия соответствующего из указанных лиц в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении этому лицу земельного участка в аренду. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин, индивидуальный предприниматель, юридическое лицо обязаны внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения) в размере его начальной цены, увеличенной на 5 процентов, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона. После совершения лицом названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, местный исполнительный комитет заключает с ним договор аренды земельного участка.

4. Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) не позднее 18 ноября 2010 года подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, а также копию платежного поручения о внесении задатка.

Кроме того, представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

5. Перечисление суммы задатка осуществляется на расчетный счет Организатора аукциона № 3012006530026 в филиале № 312 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Жлобин, код МФО 151501673, УНН 490317354.

6. Оплата стоимости предмета аукциона, расчеты с организатором аукциона осуществляются в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня принятия исполнительным комитетом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка.

Сумма задатка победителя аукциона засчитывается при оплате им стоимости земельного участка.

Всем желающим представляется возможность предварительно ознакомиться с документами по объекту и с объектом в натуре. Контактные телефоны: 8 (02334) 3 14 08, 2 18 18.

## ПРАДАЛІ ВІНТОЎКУ МОСІНА

Ну і ну!

У момант здзяйснення здзелкі па продажы вінтоўкі Мосіна і 400 патронаў калібра 7,62 мм супрацоўнікі КДБ затрымалі дваіх жыхароў аднаго з раённых цэнтраў Гомельскай вобласці. У той жа дзень былі ўстаноўленыя і затрыманыя яшчэ двое грамадзян, якія маюць дачыненне да гэтага злачынства. Як расказалі ў прэс-групе ўпраўлення КДБ па Гомельскай вобласці, па месцы жыхарства аднаго з іх аператыўнікі канфіскавалі газава-пнеўматычны пісталет, тры бляшанкі з порахам агульнай вагой каля 800 грамаў, больш за 200 патронаў калібра 7,62 мм. Па папярэдніх звестках, грамадзяне займаліся незаконнымі раскопкамі ў месцах вядзення баёў падчас Вялікай Айчыннай вайны.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

26 октября 2010 г. в 12.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «ЭнКоСтрой».

Повестка дня:

1. О совершении сделок Общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, 39.

Начало регистрации участников собрания: 12.00. УНП 191303197

**Уважаемые акционеры ОАО «Рапс»**

**28 октября 2010 года**

состоится внеочередное общее собрание акционеров **ОАО «Рапс»**, расположенного по адресу: Минская обл., Минский район, 223014, д. Крупица.

*Собрание пройдет по адресу: Минская обл., Минский район, д. Крупица, ул. Садовая, д. 20, административное здание ОАО «Рапс», первый этаж, актовый зал.*

**Повестка дня собрания:**

1. О переоформлении залога, предоставленного в ОАО «Белагропромбанк».

*С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: Минская обл., Минский район, д. Крупица, ул. Садовая, 20, ОАО «Рапс» (бухгалтерия) с 19 по 27 октября 2010 года (время работы с 14.00 до 16.00) либо 28 октября 2010 г. по месту проведения собрания. Регистрация участников собрания с 10.00 до 11.00 по месту проведения собрания.*

**Начало работы собрания — 28 октября 2010 г. в 11.00.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 21 октября 2010 года.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность, заверенную в установленном порядке!**

**Справки по тел. 8 (017) 5069414, 8 (017) 5069341.** УНП 600068480

